Аляксандр Зімоўскі загаварыў па-беларуску (гл. 4-ю стар.)

№№161–162
(2889–2890)

24 кастрычніка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93,
усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

Вось дык час настаў! Баліць галава не ў тых, хто жыве ад палучкі да палучкі альбо ад пенсіі да пенсіі, а ў тых, хто мае грошы. Прайшоўшыся па некалькіх аддзяленнях беларускіх банкаў, карэспандэнт "Народнай волі" ўпэўніўся: нягледзячы на супакойваючы настрой дзяржаўнага тэлебачання, радыё і газет, некаторы ажыятаж у банках назіраецца.

Першае, што кідаецца ў вочы, значная колькасць людзей, якія хочуць абмяняць беларускія рублі на валюту. Прычым купляюць даволі вялікія сумы — 10, 20, 30 тысяч долараў. Яшчэ месяц назад назіраць такую карціну не даводзілася.

Шмат хто закрывае свае рахункі. І як ні ўгаворваюць супрацоўнікі банкаў такіх людзей і тлумачаць, што губляюцца працэнты, і клянуцца, што ніякіх страсенняў не прадбачыцца, — людзі настойваюць, каб ім аддалі ўсе грошы і становяцца ў чаргу ў "валютнае акенца".

Мы вырашылі высветліць, ці апраўданы апасенні ўладальнікаў укладаў?

Сусветны фінансавы крызіс: што рабіць з уласнымі грашыма?

Бадай адны з самых дасведчаных у фінансавых справах людзі — гэта эканамісты. Ім толькі падкінь пытанне па профілю, і яны гадзінамі могуць разважаць пра той жа фінансавы крызіс. Праўда, як правіла, у маштабах краіны ці нават свету. Таму "Народная воля" вырашыла пайсці іншым шляхам. Мы папрасілі сваіх рэспандэнтаў уявіць, што асабіста ў іх на банкаўскіх рахунках у нашай краіне знаходзіцца сума ў 10 мільёнаў рублёў і ў дадатак — яшчэ ёсць валютны ўклад на 5 тысяч еўра. І папрасілі сказаць, што б яны, маючы такія ўклады, сёння рабілі са "сваімі" грашыма, ведаючы эканамічныя тонкасці і прадбачыўшы наступствы сітуацыі?

Думаецца, адказы спецыялістаў дапамогуць і нашым чытачам вызначыцца з пытаннем: "Што рабіць?".

Яраслаў РАМАНЧУК: «Складаць яйкі ў адзін кошык нельга»

— Ёсць такая народная мудрасць: складаць усе яйкі ў адзін кошык нельга. Таму я б захоўваў грошы і ў беларускіх рублях, і ў замежнай валюце. У выпадку, калі інфляцыя будзе расці вялікімі тэмпамі, то я перавёў бы ўсе грошы ў замежную валюту, усё ж такі верагоднасць, што "абваліцца" долар ці еўра, куды меншая, чым верагоднасць таго, што "абваліцца" беларускі рубель.

На сённяшні дзень запас трываласці беларускага рубля ёсць, крэдыты ў нацыянальнай валюце па-ранейшаму выдаюцца. Але гэты запас можа запраста скончыцца. Хаця б таму, што ў адзін цудоўны дзень доступ Беларусі да танных расійскіх крэдытаў можа быць перакрыты, альбо ў рэшце рэшт можа нечакана ўзняцца кошт на газ...

Што да ўкладаў у замежнай валюце, то калі б у мяне ў беларускім банку ляжала, як вы кажаце, 5000 еўра, то я б іх увогуле не чапаў. На мой погляд, тым уладальнікам укладаў у замежнай валюце, у якіх на рахунку знаходзіцца сума, меншая за 100 тысяч долараў, "парыцца" ўвогуле не варта. Сусветны фінансавы крызіс іх не закране...

Леанід ЗАЇКА: «Я трымаў бы грошы ў банку, які кантралюецца дзяржавай»

— Па-першае, 10 мільёнаў беларускіх рублёў — сума невялікая. Я б з імі ўвогуле нічога рабіць не стаў. Калі сума на банкаўскім рахунку была б большай, тады я б аберагаў грошы наступным чынам: раздзяліў бы сродкі і нейкую іх частку перавёў бы ў замежную валюту — расійскі рубель, долар і еўра.

Другі крок, які можна было б зрабіць, — гэта перавесці грошы ў розныя банкі краіны: напрыклад, у "Беларусбанк" і "Знешэканомбанк". Пры выбары банка я б спыніўся на тым, які падтрымліваецца дзяржавай.

Яшчэ адзін крок, які я зрабіў бы, прадчуваючы, што грошы могуць знікнуць, — гэта ўклаў бы іх у нешта. Напрыклад, абнавіў бы ўласнае аўто. А вось у нерухомасць укладваць грошы я б не раіў: з кожным днём гэты від становіцца ўсё больш бессэнсоўным, і нерухомасць будзе таннець. Вось вам прыклад. Я нядаўна наткнуўся на такую аб'яву: двухпакаёвую кватэру ў Італіі ў 14-ці кіламетрах ад мора прапаноўваюць купіць за 40 тысяч долараў. Прадаўшы кватэру ў Курасоўшчыне за 80 тысяч тых жа долараў, я б запраста знайшоў сабе працу на адным з італьянскіх пляжаў...

Што тычыцца 5000 еўра, якія б ляжалі ў мяне на рахунку, то тут бы я ўвогуле не мітусіўся. Тым больш што я добра разумею: калі б усе сталі забіраць свае невялікія ўклады ў валюце з банкаў, то ў краіне атрымалася б нешта анархічнае... Тут, як пры пажары. Вы ведаеце, што часцяком людзі пры пажары выносяць з хаты рэчы не зусім неабходныя... З банкаўскімі ўкладамі ў валюце тое ж самае — забіраць іх не варта...

Леанід ЗЛОТНІКАЎ: «Мяняйце грошы на золата»

— Беларускія грошы я б перавёў у валюту. Калі б зразумеў, што крызіс набывае больш жорсткі характар, то ўклаў бы грошы ў золата. Гэта бяспройгрышны варыянт.

Шчыра кажучы, цяжка прадказаць, чым адгукнецца той ці іншы фінансавы крызіс, але некалькі прыкмет яго наступлення ўсё-такі ёсць і ў нас. Пакуль звычайным людзям гэтыя прыкметы не заўважныя і будзем спадзявацца, што нічога экстрэмальнага не адбудзецца. Але я назаву прыкметы, па якіх кожны чалавек будзе ў стане пачуць "трывожны званок".

Першая прыкмета таго, што крызіс паглыбляецца — гэта неліквіднасць банкаў. Прасцей кажучы, неплацежаздольнасць банкаў. Калі чалавек прыходзіць у банк, каб зняць свае грошы, а яго просяць пачакаць, гэта значыць, што ў банка праблемы...

Другая прыкмета — гэта падзенне вытворчасці. Калі ад суседзяў, сяброў родных вы пачняце чуць, што і адзін, і другі, і трэці завод прыпыняюць працу, што людзей адпраўляюць у адпачынкі...

Што тычыцца 5000 еўра, якія вы мне "намалявалі", то адзінае, што б я зрабіў з імі, дык гэта перавёў бы нейкую іх частку ў долары ЗША.

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота photo.bymedia.net

Ці гарантуе дзяржава вяртанне ўкладаў?

Як нам паведамілі ў Нацыянальным банку, на сённяшні дзень дзяржава гарантуе поўнае кампенсаванне толькі валютных укладаў у шасці банках. Гэта "Беларусбанк", "Белагрупрамбанк", "Пріорбанк", "БПС-банк" ("Белпромстройбанк"), "Белзнешэканомбанк" і "Белзнешінвестбанк".

У дачыненні да астатніх банкаў, а таксама ў дачыненні да рублёвых укладаў ва ўсіх банках, дзяржгарантыя на кампенсацыю складае ў эквіваленце толькі 1 тысячу долараў. Але так будзе цягнуцца нядоўга. У адпаведнасці з прынятым летам 2008 года законам, з 1 студзеня 2009 года павінна пачаць працу дзяржаўнае агенцтва па гарантаванні кампенсацыі банкаўскіх укладаў насельніцтва.

Вызначаны і парадак кампенсацыі грашовых сродкаў фізічных асоб, размешчаных ва ўклады (дэпазіты) банкаў, у тых выпадках, калі банк самастойна будзе не ў стане выканаць свае абавязацельствы перад грамадзянамі. Новы закон гарантуе грамадзянам Беларусі поўнае вяртанне іх укладаў (незалежна ад валюты) у любым банку. Але на суму, эквівалентную толькі 5 тысячам еўра.

На нядаўняй сустрэчы з кіраўніком Нацыянальнага банка Пятром Пракаповічам Аляксандр Лукашэнка, праўда, даў даручэнне, каб была прадугледжана магчымасць кампенсацыі ўсіх укладаў і ў любым памеры. Але пакуль гаварыць пра гэта заўчасна, бо невядома, на якіх умовах будуць вяртацца ўклады, праз які перыяд, у якой валюце і т.п. Планы — яны і ёсць планы. Заява можа аказацца проста прапагандысцкім крокам, каб прыцягнуць у гэты няпросты перыяд як мага больш сродкаў у банкаўскі сектар.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Что было, то — будет

Недавно я стал благодарным обладателем и читателем книги под названием "Что было, то — было". Одним из ста, если иметь в виду ее скромный тираж.

Это вторая книга воспоминаний поэта Александра Дракохруста, первая под таким же названием вышла в 2006-м, тоже в весьма малом количестве и в бумажной обложке...

Я вспомнил историю, случившуюся с Александром Блоком в голодном и холодном Петрограде. Ее рассказывал знаменитый в конце прошлого века литератор и рассказчик Ираклий Андронников. В тот петроградский день стоял жуткий мороз, на широко объявленную лекцию Блока пришел всего один человек. Согревая дыханием замерзающие пальцы, Блок почти три часа читал лекцию этому человеку...

Сегодня в той истории удивляет не столько Блок, сколько человек, который три часа слушал. Но для того, конечно, чтобы тебя слушали, надо было быть Блоком...

Можно, разумеется, понять литераторов, которым хочется, чтобы их сочинения прочло как можно больше людей. Но есть литераторы, которым это важнее всего. Случается даже, что писатели перестают писать, не имея возможности издаваться многотысячными тиражами. Или, зная, что книга все равно продаваться не будет, все деньги спонсоров, если не хватает своих, вбухивают в обложку, делая из книги некое подобие подарочной коробки конфет...

Буквально на днях я держал в руках такую книгу. Достаточно известный белорусский литератор почти всю ее посвятил собственной личности. Всем остальным участникам исторической драмы в конце прошлого и в начале нынешнего веков отведена роль статистов, а некоторые из них появляются в книге лишь для сведения счетов. Особенно умиляют страницы, на которых публикуются всевозможные резолюции, постановления и факсимильные копии документов, чье авторство, как и самой книги, отмечено печатью уязвленного гения. Ну как не умилиться почтовому уведомлению о том, что телеграмма, посланная автором, дошла до адресата, если адресат живет в Кремле и фамилия его Горбачев!..

И все это почему-то называется исторической правдой.

Увы!

Так коротко можно охарактеризовать явление, возникшее в нынешнем, учено выражаясь, литературном процессе, если спроецировать на него историю с Блоком. Особенно в той части упомянутого процесса, которую принято называть мемуаристикой, хотя бы и посредством газет, и в которую вовлечено большое количество современников. Достаточно почитать все, что пишут иные литераторы, ушедшие в политику, или иные политики, ставшие литераторами, чтобы кроме интереса и волнения испытать стыд. Стыд за дележку исторического пирога, за место в несбывшемся пантеоне славы, за сведение счетов, в котором уходит на второй план, если не исчезает совсем, столь необходимый всем нам большой Счет Истории.

А ведь мемуары, по моему убеждению, как никакой другой жанр, требуют от автора исповедальной честности, мужества и самоотречения, в том числе от соблазнительной возможности возвести себя любимого на исторический пьедестал. И все это совершенно не зависит от количества экземпляров.

Так и хочется посоветовать всем, кто берется сочинять мемуары, взять в пример быковскую "Доўгую дарогу дадому", "На высьпе ўспамінаў" Валентина Тараса...

"Что было, то — было" Александра Дракохруста — в этом ряду.

По меньшей мере четыре эпохи отразились в книге: сталинская с ее ГУЛАГом и выбросом в антифашистскую войну, хрущевская "оттепель" с переходом в антисталинизм шестидесятников, горбачевская перестройка, ушедшая в ельцинский прорыв, путинская реставрация и лукашенковское всевластие, заслонившее историческую перспективу...

Но при всей разности темперамента, таланта, исторического материала и житейского опыта названных и не названных писателей из одной горной гряды объединяет их не только фактическая принадлежность к одному поколению, но и беспощадное, прежде всего к самим себе, требовательное постижение правды. Не истины — претензии на нее свойственны людям мелким и самовлюбленным, но правды. Через ошибки и заблуждения, через обретения и потери, через раны, смерти и боль...

"Жизнь часто напоминает калейдоскоп, — пишет Дракохруст. — Перед глазами в течение долгих лет возникают все новые и новые комбинации событий, ситуаций, характеров, человеческих лиц. Эти комбинации какое-то время, в особенности поначалу, представляются нам оригинальными, возникшими лишь на нашем веку. А между тем, постарев и став поопытнее, мы убеждаемся: все (или почти все) уже было, было - пусть в другие эпохи, в других условиях, на другом уровне, в иных декорациях. И становится совершенно очевидной конечность для каждого из нас этих сменяющих друг друга "картинок" калейдоскопа жизни. А он попрежнему будет демонстрировать их перед глазами тех, кто придет или уже пришел нам на смену".

Грустное наблюдение — все, что было, еще не раз обязательно будет. "И повторится все, как встарь...".

Но таится в нем скрытое, не декларируемое напоминание: все, чем живет и дышит человек в разные времена, сберегается не только памятью, но и мужественным, подчас драматическим, неприятием лжи.

Только в этом случае прожитое и пережитое, ушедшее, казалось, в небытие, становится частью живущего и стремления дальше жить.

Еще и потому — будет.

kamerton_41@mail.ru

ОТ РЕДАКЦИИ

Отрывки из новой книги Александра Дракохруста "Что было, то — было" читайте в ближайших номерах.

Аўтакрэдыты: ёсць праблемы

Сітуацыя на беларускім рынку аўтакрэдытавання з-за сусветнага фінансавага крызісу істотна пагоршылася. Пра гэта заявіў памочнік генеральнага дырэктара міжнароднага аўтамабільнага холдынгу (МАХ) "Атлант-М" Ілля Прохараў.

Паводле яго слоў, некаторыя банкі, якія актыўна працавалі ў сферы аўтакрэдытавання, часова спынілі выдачу валютных крэдытаў на куплю аўто. Іншыя банкі значна перагледзелі ўмовы заключэння новых крэдытных дагавораў. Узамен крэдытаў у замежнай валюце банкі прапаноўваюць крэдыты ў нацыянальнай валюце з працэнтнымі стаўкамі 19—21%. "Можна казаць пра тое, што сітуацыя пагоршылася. Многія банкі занялі чакальную пазіцыю, крэдытаванне або спынена, або ўзраслі стаўкі. З другога боку, у нашай краіне сітуацыя ў гэтым сэнсе яшчэ далёка не такая дрэнная, як, скажам, ва Украіне", — зазначыў эксперт.

Разам з тым Ілля Прохараў лічыць, што беларускі аўтамабільны рынак таксама чакаюць нялёгкія часы і разлічваць на такія высокія тэмпы росту, як раней, у дадзенай сітуацыі не даводзіцца. "Калі ўлічыць той факт, што ў Беларусі каля 60% новых аўто прадаецца ў крэдыт, то падзенне ўзроўню продажу будзе непазбежнае", — сказаў памочнік генеральнага дырэктара МАХ "Атлант-М".

Аляксей АРЭШКА.

ВЕРЫЦЬ — НЕ ВЕРЫЦЬ

Афіцыйныя асобы заяўляюць пра частковую амністыю капіталаў

З дня на дзень будзе абвешчана пра тое, што здымаюцца абмежаванні на прыцягненне ўкладаў фізічных асоб у банкаўскую сістэму Беларусі. "Гэта можна разглядаць як частковую амністыю капітала," — тлумачыць Упраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка. Але для каго?

Дзяржаўныя СМІ афіцыйна паведамілі пра распрацоўку ўказа прэзідэнта, які дазволіць фізічным асобам (у тым ліку нерэзідэнтам — грамадзянам іншых краін) размяшчаць уклады ў беларускіх банках не толькі ў неабмежаваных аб'ёмах, але і без дэкларацыі аб даходах.

На сённяшні дзень укладчык павінен задэкларавать крыніцы даходаў у тых выпадках, калі адкрывае рахунак на суму, большую, чым дзве тысячы базавых велічынь. Нагадаем: 1 базавая велічыня складае 35 тысяч беларускіх рублёў, такім чынам, 2000 базавых велічынь — гэта крыху болей за 33 тысячы долараў ЗША.

"Вялікая фінансавая лібералізацыя", як гэта падае афіцыйная прапаганда, на самай справе можа парадаваць толькі тых іншаземцаў, хто захоча ў Беларусі схаваць грошы ад сваіх падатковых і праваахоўных органаў (калі, зразумела, Беларусь выканае абяцанне аб поўнай гарантыі тайны ўкладаў). Беларусам на такія абяцанкі купляцца вельмі рызыкоўна.

Як высветліла "Народная воля", калі вы будзеце адкрываць рахунак у банку, у вас сапраўды не запытаюцца пра тое, дзе вы ўзялі грошы. Але, не выключана, што праз некаторы час вы атрымаеце запрашэнне да падатковікоў, дзе вам такое пытанне абавязкова зададуць.

Атрымоўваецца, што ніякая гэта не рэвалюцыя, як падаецца на першы погляд. Беларусь адчыняе дзверы для замежных сумнеўных капіталаў. Вось і ўсё.

Для банкаўскай сферы дадатковыя мільёны долараў, зразумела, стануць добрай дапамогай. Але з палітычнага і этычнага пункту погляду тут ёсць пытанні. Да таго ж, на думку некаторых экспертаў, такі крок можа азначаць, што дэфіцыт валютных сродкаў беларускага банкаўскага сістэма ўжо адчувае.

Званок знаёмаму падатковаму інспектару.

— Па патрабаванні Міністэрства па падатках і зборах грамадзянін Беларусі павінен прадаставіць дэкларацыю аб даходах, у якой трэба ўказваць і памеры банкаўскіх укладаў, якія чалавек мае. Падставай для патрабавання дэкларацыі можа стаць што заўгодна: падаткавікі гэтага нікому тлумачыць не павінны, затое грамадзяне адмовіцца ад падачы дэкларацыі не могуць. Сітуацыя тут такая ж, як і з набыццём кватэр: з аднаго боку, калі вы купляеце кватэру, прадастаўляць дэкларацыю аб даходах не трэба. Але, атрымаўшы звестці з Бюро тэхнічнай інвентарызацыі, мы выклікаем пакупніка кватэры і пытаемся, дзе ж ён узяў грошы? Што зробіш, такое заканадаўства?!

— А калі чалавек не здолеў пацвердзіць "легальнасць" сваіх даходаў?

— То налічваем падатак на даходы.

— Але набыццё кватэры — гэта ж не даход, а расход?

— Дык вы ж перад тым, каб патрацціца, неяк гэтыя грошы атрымалі, мелі даход...

— І даказваць, што грошы былі недзе зароблены "нелегальна", не трэба?

— Не, не трэба. Нас цікавіць толькі памер падатку, які чалавек павінен аплаціць.

— Абяцаная "свабода" банкаўскіх укладаў мае пад сабой тыя ж падводныя камяні?

— Пакуль не змянялі Падатковы кодэкс і Закон аб падаходным падатку, атрымоўваецца што так.

— Падман?..

— Я не буду адказваць на гэтае пытанне.

Алена НОВІКАВА.

ДАРЭЧЫ

У Беларусі дзейнічаюць 30 банкаў. Уклады фізічных асоб могуць прыцягваць банкі з капіталам не менш, чым 10 мільёнаў еўра у эквіваленце і не раней, чым праз 2 гады з даты рэгістрацыі пры ўмове паспяховай працы.

КАЛІ ВЯРСТАЎСЯ НУМАР

У аўторак к канцу дня стала вядома, што Расія прыняла рашэнне аб выдзяленні Беларусі 2 мільярдаў долараў у якасці крэдыту. Пра гэта паведаміў віцэ-прэм'ер расійскага ўрада, міністр фінансаў Аляксей Кудрын.

1 мільярд долараў будзе выдзелены ў гэтым годзе, яшчэ адзін — у наступным. Умовы выдзялення крэдыту пакуль не агучаны. Але гэтыя грошы значна аблегчаць жыццё беларускай банкаўскай сістэме.

Пытанне, як мы будзем потым разлічвацца па гэтых крэдытах, праўда, застаецца адкрытым.

ЗДАРЭННЕ

Аварыя, якая ўзрушыла Мінск

Пра ДТЗ, якое адбылося ў цэнтры Мінска вечарам 16 кастрычніка, некалькі дзён гаварылі ва ўсіх школах горада.

Мінскі 11-класнік п'яным сеў за руль машыны маці і не справіўся з кіраваннем. Машына перакулілася на ўезздзе на плошчу Бангалор. У выніку загінулі ягоныя сябры — пасажыры аўто: хлопец 1990 года нараджэння і 20-гадовая дзяўчына.

Віноўнік ДТЗ з месца здарэння... наўпрост уцёк.

Яго асоба была ўстаноўлена практычна адразу. Пачаўся вышук. Сталі вядомы сенсацыйныя падрабязнасці: школьнік ужо двойчы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення! Вось такія яны — цяперашнія дзеткі!

У выніку толькі ў панядзелак віноўніка гібелі двух чалавек прывяла ў міліцыю маці.

У ДАІ горада пакуль адмаўляюцца ад каментарыяў наконт гэтага здарэння.

Алег СНОЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ПАЗІЦЫЯ

Астравецкая атамная — гэта злачынства!

Азнаёміўся з вялізнай, на ўвесь разварот газеты, публікацыяй у нумары "Астравецкай праўды" ад 16.08.2008г. пад назвай "Астравецкая атамная: што дзень наступны нам рыхтуе?" — і вельмі балюча стала за тое, што ніяк не вучацца нашы людзі на сваіх жахлівых памылках. Не робяцца больш адказнымі за ўласны лёс і лёс сваіх нашчадкаў. Гатовыя наступаць на адны і тыя ж граблі, хоць, напэўна, і чулі, што разумныя людзі наогул павінны вучыцца не на сваіх, а на чужых памылках.

Як вынікае з "круглага стала" ў рэдакцыі раённай газеты, у гэтым мерапрыемстве прынялі ўдзел, несумненна, разумныя людзі. Праўда, усе яны прадстаўляюць толькі адзін, афіцыйны, а гэта значыць — уладны спектр меркаванняў па згаданай праблеме. Удзел у дыскусіі прынялі толькі службовыя асобы ад палітыкі, энергетыкі, эканомікі і медыцыны. І — ніводнага прадстаўніка грамадскасці, незалежнага ад сённяшняй улады. А таму ўсе без выключэння ўдзельнікі размовы, пачынаючы з дэпутата ППНС РБ, першага сакратара ЦК КПБ Т.Голубевай і заканчваючы служывым людам з астравецкіх кабінетаў улады, узахлёб і наперабой рэкламавалі атамную энергетыку ў цэлым і ратавалі за тое, каб яна як мага хутчэй прыйшла ў Беларусь, а на нашу Астравеччыну ў прыватнасці. Усе агучылі, у межах сваёй кампетэнцыі, афіцыйную пазіцыю сённяшняй улады наконт мяркуемага будаўніцтва ў нашым раёне атамнай электрастанцыі. І ні адзін не сказаў наўпрост, а што думае ён асабіста як жыхар раёна наконт будаўніцтва АЭС у сябе пад бокам, каля свайго ўласнага дома ці на тым самым месцы, дзе так любіць адпачываць, вудзіць рыбу, збіраць грыбы і ягады, прыходзіць на спатканне з каханай.

Безумоўна, гэтых людзей можна зразумець: яны не свабодныя ў сваіх меркаваннях. Да таго ж гаварыць праўду ў нашай "самай дэмакратычнай" краіне вельмі небяспечна.

Вось чаму я лічу патрэбным выказаць асабістае меркаванне простага чалавека, які не залежыць ад улады і які адпаведна не падзяляе яе безагляднага аптымізму наконт будаўніцтва АЭС як у Астравецкім раёне, так і наогул у Беларусі.

Як спецыяліст з кваліфікацыяй географа і настаўніка геаграфіі, які скончыў у 1974 годзе геолага-геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, хачу запоўніць дапушчаны прабел праведзенага "стала" і выказаць бачанне звычайнага, але трохі дасведчанага жыхара Астравецкага раёна па пытанні будаўніцтва АЭС.

Лічу адназначна: будаваць у Астравецкім раёне атамную электрастанцыю нельга. Па-першае, меркаванні, што менавіта Астравецкая пляцоўка па геалагічным чынніку нібыта самая бяспечная, а таму і прывабная, у мяне выклікаюць вялікі сумнеў. З універсітэцкага курсу па геалогіі вядома: на пачатку мінулага веку менавіта ў Астравецкім раёне адбыўся землятрус, у выніку чаго ўтварыўся лакальны разлом зямной кары. І сведчыць гэта зусім не аб яе магутным, а, наадварот, ломкім, сейсманенадзейным стане... Разлом праходзіць дзесьці ў раёне Гудагая, што па геаграфічных мерках вельмі блізка да магчымай пляцоўкі будучай АЭС. А таму сцвярджаць аб нейкай асаблівай сейсмастойкасці і прывабнасці па гэтым чынніку будаўніцтва АЭС у нашым раёне адназначна не выпадае. Маё сцвярджэнне не зможа абвергнуць ні адзін з самых дасведчаных спецыялістаў у вобласці геалогіі. Наадварот, яны пацвярджаюць, што па сейсмічнасці Астравецкая пляцоўка на адзін бал апярэджвае сваіх канкурэнтаў...

Па-другое, будаваць АЭС у нашым раёне нельга таксама і з улікам ружы вятроў. Як вядома кожнаму астравецкаму шасцікласніку, у нас на працягу года пераважаюць заходнія вятры, якія ад АЭС будуць пакрываць усю тэрыторыю Беларусі з захаду на ўсход. Менавіта з улікам ружы вятроў у Літве ў свой час і была пабудавана Ігналінская АЭС. А цяпер і новую АЭС там плануюць узводзіць не на захадзе краіны, дзе-небудзь на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, а зноў жа на ўсходніх ускраінах краіны, што вельмі непажадана для нас, беларусаў.

І, нарэшце, трэці геаграфічны чыннік, які пярэчыць будаўніцтву АЭС у Астравецкім раёне, — блізкасць запаведнай і буйнейшай у краіне Нарачана-Вілейскай рэкрэацыйнай зоны, дзе штогод праходзяць аздараўленне дзесяткі тысяч беларусаў і замежных гасцей: яе вялізны і яшчэ далёка не выкарыстаны патэнцыял у выніку будаўніцтва Астравецкай АЭС у адначассе будзе зруйнаваны. Таму, што ў выніку ўзвядзення такога магутнага прамысловага аб'екта з вялізнай разгалінаванай інфраструктурай у навакольным асяроддзі адбудуцца непазбежныя парушэнні экалагічнай раўнавагі, якія не ў стане спрагназаваць зараз ні адзін з самых знакамітых спецыялістаў і ні адзін самы магутны камп'ютэр.

Напрыклад, хто сёння можа даць цвёрдую гарантыю, што з будаўніцтвам АЭС добрая палова, калі не ўсё насельніцтва раёна, не застанецца без пітной вады, а рака Вілія не ператворыцца ў сточную канаву?

І гэта — толькі кветачкі, абавязкова будуць і ягадкі.

Я даю далёка не поўны пералік тых "Не" для будаўніцтва АЭС у Астравецкім раёне, якія вынікаюць з пункту гледжання геолага-геаграфічнага чынніка.

Акрамя таго, вышэйзгаданае будаўніцтва не толькі ў нашым раёне, але і наогул у краіне не вырашыць усе сённяшнія эканамічныя праблемы Беларусі. І ў першую чаргу — праблему энергетычнай, а разам з ёй і палітычнай бяспекі краіны. Менавіта таму, што ўранавая сыравіна таксама, як і нафта з газам, знаходзіцца ў Расіі. Хто ж нам, акрамя яе, дасць гэтую стратэгічную сыравіну? А таму залежнасць Беларусі ад Расіі як і была, так і застанецца, а то і ўзрасце. У тым ліку і таму, што ў Беларусі ні вопытных спецыялістаў-атамшчыкаў, ні сваёй школы кадраў, ні нават грошай на будаўніцтва АЭС няма.

Дык адкажыце, шаноўныя ўдзельнікі "стала", навошта нам ізноў гэтае ярмо на шыю шматпакутнага беларускага народа? Ці, можа, вам так хочацца хутчэй стаць 90-м суб'ектам у былой імперыі? Альбо, можа, вы лічыце, што мы сёння так багата жывём, што можам дазволіць сабе без рады з народам нейкія эфемерныя і небяспечныя праекты, прасякнутыя маніяй вялікасці?

Што ж тычыцца адзінай перавагі будаўніцтва АЭС у нашым раёне, што было разрэкламавана падчас "стала", — стварэнне мноства новых працоўных месц, — то можна сябе не цешыць загадзя. Гэтыя месцы атрымаюць адзінкі. На будоўлю кінуць даўно і добра ўкамплектаваныя буйныя спецыялізаваныя будаўнічыя трэсты, многія з працаўнікоў якіх тут і асядуць. Так што, людзі, будзьце пільнымі і не паддавайцеся на падман. Як, дарэчы, сказана ў Бібліі: бойцеся *"данайцаў, што дары прыносяць"*. Не толькі не атрымаеце нічога добрага з гэтых "дароў", але наклічаце на сябе вялікую і непапраўную бяду. Як мінімум трапіце пад перасяленне. Вам гэта трэба?

Але хопіць песімізму. Я не стану заканчваць гэтую публікацыю на мінорнай ноце. Упэўнены: здаровы сэнс павінен перамагчы, і АЭС не павінна быць не толькі ў нашым раёне, а і ў Беларусі наогул. Ва ўсялякім выпадку пакуль. Таму што да гэтага мы яшчэ не дараслі ні тэхнічна, ні эканамічна, ні псіхалагічна. Акрамя таго, у нас яшчэ хапае нявыкарыстаных рэзерваў для развіцця эканомікі — галоўнае іх па-гаспадарску выкарыстоўваць, а не транжырыць, як гэта мы бачым на кожным кроку. Але гэта тэма для асобнай размовы.

Калі ж будзе вырашана — АЭС быць! — то гэта будзе ўжо не проста памылка, а злачынства перад сваім народам, за якое вінаватыя раней ці пазней павінны будуць адказваць.

Мікалай УЛАСЕВІЧ,
жыхар в.Варняны
Астравецкага раёна.

ЦЭНЫ

Газ падаражэў

Цана на звадкаваны газ у балонах, што рэалізуецца насельніцтву, з 20 кастрычніка павялічылася на 30%. Такое рашэнне прыняло Міністэрства эканомікі.

Згодна з дакументам, цана на газ для заправкі газавых балонаў аб'ёмам 1 л (0,4 кг), 5 л (2 кг), 12 л (5 кг), 27 л (11,4 кг) устаноўлена ў памеры 1300 рублёў за 1 кг.

Нагадаем, папярэдняе падаражанне звадкаванага газу ў балонах на 33% (да 1 тыс. рублёў за кг) адбылося ў ліпені гэтага года.

Марына НОСАВА.

ПАДЛІЧЫЛІ

Самая высокая заработная плата — у нафтавікоў, самая нізкая — у бібліятэкараў

Як паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт, сярэднія заробкі беларускіх нафтавікоў складаюць 1 млн 974 тыс. рублёў, а самыя нізкія даходы маюць бібліятэкары — усяго 487 тыс. рублёў.

На прамысловых прадпрыемствах заробкі наблізіліся да 500 долараў. Але гэта сярэдні паказчык: у чорнай металургіі паказчык сладае 1 млн 641 тыс., у хімічнай прамысловасці — 1 млн 518 тыс., а швеі, напрыклад, атрымліваюць толькі 588 тыс. рублёў.

Высокія заробкі і ў будаўнікоў — сярэдні паказчык склаў 1 мільён 283 тыс. рублёў.

Аплата працы на сельгаспрадпрыемствах па-ранейшаму значна ніжэйшая, чым сярэдні паказчык па краіне — 703 тыс. рублёў. Не дасягнулі сярэдняга паказчыка і заробкі медыкаў — 712 тыс. рублёў, настаўнікаў — 654 тыс., дзеячаў культуры і мастацтва — 628 тыс., у тым ліку артыстаў — 732 тысячы.

А вы пытаецеся, чаму не дзешавее бензін?.. Таму што заробкі тых, хто яго вырабляе, "цягнуць" угару ўсю статыстыку.

Алена НОВІКАВА.

БЕЛАРУСЬ—РОССИЯ

Первый шаг к референдуму?

Конституционный акт Союзного государства введения президентского поста не предусматривает, но Госсовет может принять любое решение

Только-только мы расслабились, как вновь всплыл злобный призрак с востока — проект Конституционного акта Союзного государства. Объявлено, что Комиссия по разработке проекта Конституционного акта Союзного государства России и Беларуси завершила согласование документа и передала его в Высший госсовет. Александр Лукашенко и Дмитрий Медведев намерены встретиться 3 ноября и на столе перед ними будет лежать проект Конституционного акта.

"Однако это не означает, что Высший государственный совет будет его рассматривать немедленно, — пояснил председатель Палаты представителей Национального собрания Беларуси Вадим Попов. — *Там тоже есть эксперты, которые, проанализировав документ, могут принять решение вернуть его на доработку..."*

Пресс-секретарь государственного секретаря Союзного государства **Иван Макушок**, сообщая о повестке дня предстоящей встречи, пошел еще дальше. Он сообщил: *"Будет рассмотрен Конституционный акт, который так долго готовился. Союзное государство — это не только принятие Конституционного акта, это прежде всего те союзные программы, о которых мы так долго говорили. Это единая валюта, которая, надеемся, в ближайшее время будет принята, вначале это будет российский рубль".*

Естественно, эта информация не может не вызывать тревогу. Несет ли Конституционный акт угрозу независимости нашей страны? Что предусматривает этот документ?

Как сообщил сенатор Николай Чергинец, несмотря на то, что работа над документом завершена, много значительных для деятельности Союзного государства пунктов так и остались не прописаны. Например, кто и как будет им управлять. *"Этот вопрос остался открытым. Как и банковские дела, и вопрос единой валюты",* — приоткрыл завесу тайны над документом глава комиссии по международным делам Совета республики.

Николай Чергинец считает, что документ еще не готов, что в нем будут дополнения и уточнения и именно этим объясняет то обстоятельство, что ознакомиться с проектом широкая общественность не может. *"Документ в Москве остался, в рабочей группе. И они его не дают пока. Ведь что с ним знакомить, если это может быть 20-й вариант. Он вызовет ненужные разговоры на тему, которая еще не созрела",* — пояснил Чергинец. И пообещал: *"Если Конституционный акт будет одобрен на Высшем госсовете, то в обеих странах пройдет референдум по этому вопросу".*

Напомним, что российские политики в последнее время стали "подгонять" Беларусь с принятием решения по Конституционному акту. В частности, как сообщают российские СМИ, на этот документ "завязаны" планы по созданию единой белорусско-российской группировки ПВО, выделение Беларуси нового кредита и т.п. Пока Беларуси удавалось увиливать от настойчивых предложений и ссылаться на несогласованности и недоработки (именно это по инерции продолжает делать Николай Чергинец). Но удастся ли подобная тактика на этот раз?

Валерия ЕСИНА.

ІНІЦЫЯТЫВА

Сяргей Панамароў: «Папросім Аляксандра Лукашэнку...»

Грамадскі актывіст з Клецка Сяргей Панамароў вырашыў збіраць подпісы грамадзян пад зваротам да Аляксандра Лукашэнкі.

"Вы кіруеце краінай амаль 15 гадоў і за гэты перыяд людзі стаміліся ад боязі згубіць працу, росту цэн і квартплаты, стаміліся баяцца выказваць сваё меркаванне, — напісана на бланку звароту. — **Трэба аднавіць справядлівасць і вярнуць народу годнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Спадзеючыся на Вашу адэкватнасць, розум і логіку, прашу — не балатавацца на чацвёрты тэрмін у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь!"**

— Пра такую ініцыятыву гаварылі яшчэ тры гады таму, але тады гэтую ідэю нашы асобныя апазіцыйныя лідэры "зарубілі", — распавядае Сяргей ПАНАМАРОЎ. — І я вырашыў сам асабіста заняцца гэтым. Збіраю подпісы па рэгіёнах, тэлефаную знаёмым... Думаю, што рэальна паказаць, што не ўсе 90 працэнтаў выбаршчыкаў аддаюць галасы за Аляксандра Лукашэнку. Нават у нас на перыферыі людзі хаця і баяцца, але падпісваюць зварот, пакідаюць свае кантакты. Хаця і не ўсе вераць, што з гэтай ідэі нешта атрымаецца.

— Акрамя вас, гэтым нехта займаецца?

— Я хачу прапанаваць сваю ініцыятыву Аляксандру Мілінкевічу, Партыі БНФ, хачу сустрэцца з Аляксандрам Казуліным... Можа, каго і зацікавіць.

— Збіраеце подпісы... А што далей?

— Пакуль нават і не думаў пра гэта — да прэзідэнцкіх жа выбараў яшчэ амаль два гады. Але калі за год нам удасца сабраць хаця б па тысячы подпісаў з кожнага раёна, гэта ўжо будзе нечага варта. Перададзім гэтыя лісты нашым апазіцыйным лідэрам, а тыя няхай ужо вырашаюць.

— Напярэдадні апошніх прэзідэнцкіх выбараў таксама была ініцыятыва па стварэнні руху "Воля народа". І менавіта ў вашым рэгіёне быў скандал, бо многія з "падпісантаў" аказаліся "мёртвымі душамі"...

— Тых людзей, якія ўдзельнічалі ў тым "праекце", зараз не варта нават на крок да сябе падпускаць.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

МНЕНИЕ УЧЕНОГО

Нужна ли нам «атомная бомба, дающая электричество»?

Пресса пестрит сообщениями о строительстве в Беларуси атомной станции. И ни слова о том, а нужно ли нам браться за это опасное дело.

Сама затея расщеплять атом для получения электроэнергии оказалась в истории человечества не самой разумной. Мало того, что эти так называемые мирные атомные реакторы исходно предназначались для выработки начинки атомных и водородных бомб. Электроэнергия стала для них побочным продуктом. Но само поведение этих реакторов очень быстро убедило всех, что этот способ получения электроэнергии является самым опасным из всех известных. К тому же выяснилось, что получаемая энергия оказывается и очень дорогой. Те, кто утверждает обратное, или ничего не смыслят в этом, или пытаются преднамеренно ввести нас в заблуждение. Так, по оценкам российского академика Ж.Алферова, всего пятнадцати процентов от того, что затрачивается на атомную энергетику, хватило бы, чтобы освоить иные и совершенно безопасные способы получения энергии. Известно также, что атомные станции вырабатывают прежде всего не электроэнергию, а огромное количество опаснейших радиоактивных отходов. И, что очень важно, никто в мире до сих пор не нашел способ надежного захоронения этих отходов.

Многие аварии продемонстрировали всем, насколько страшным может оказаться реактор, вышедший из-под контроля. Не случайно российский академик П.Капица назвал АЭС "атомной бомбой, дающей электричество".

Но и после своей "кончины" атомная станция не может почить спокойно: она на сотни и тысячи лет остается страшно опасным объектом, требующим дорогостоящего обслуживания и надежной охраны.

Ориентировочная загрузка планируемого числа реакторов предварительно обогащенным топливом за 30 лет их эксплуатации составит более 22 тысяч тонн. Пребывание в реакторе этого исходно низкоактивного топлива превращает его в то же количество высокоактивного отработавшего ядерного топлива. И с этим огромным количеством опаснейшего вещества нужно будет что-то делать. Увы, повторяю, нигде в мире не найдено надежных способов захоронения и практически вечного хранения таких отходов. А перерабатывать его еще накладнее. При этом количество высокоактивных жидких отходов составит миллион кубических метров, среднеактивных -- 3,5 миллиона кубических метров, низкоактивных -- 45 миллионов кубических метров. И все это уйдет в наши земли и воды. Разве позволительно столь жестоко и безжалостно относиться к дарованной нам природе?

Вот и получается, что ориентирование на развитие ядерной энергетики грозит людям серьезными экономическими, экологическими, а значит, и социальными последствиями. Такое безалаберное отношение к самим себе невозможно понять и, тем более, простить.

Плотность загрязнения чернобыльскими радионуклидами территории Беларуси в 20 раз выше, чем Украины. Ничего подобного больше ни одна страна мира не испытала. Казалось бы, что это должно было выработать у нас на вечные времена иммунитет от страшной болезни, именуемой "мирным атомом". Неужели же память оказалась столь короткой? Нет, не у людей, а у руководителей. Людей ведь никто и не спрашивал. Вот сами бы и наступали на старые грабли! Народ-то зачем подставлять? Остается лишь надеяться на то, что старые грабли успеют как следует ударить еще до того, как в Беларуси появится "своя национальная АЭС". Игра ведь идет не на жизнь, а на смерть страны Беларусь и ее людей. Разве кому-то давалось право играть на костях и без того многострадального народа?

Еще об одной "шутке". Мы только и слышим разговоры о какой-то энергетической безопасности. Мол, нельзя в энергетике зависеть от одного поставщика. В Беларуси при этом имеют в виду Россию. Можно подумать, что все страны мира так и бросятся снабжать Беларусь ядерным топливом. Попробовал проанализировать эту проблему физик Юрий Воронежцев. И пришел к вполне реальной ситуации: никто не рискнет предоставить белорусскому режиму радиоактивное топливо. Примером этого может служить Иран. И опять надежда только на "щедрость" России. Так где же она -- эта энергетическая безопасность?

Когда прогремел чернобыльский взрыв, ученые мира единодушно пришли к убеждению, что наш мир второй такой катастрофы может не выдержать: уже сегодня наша экология балансирует в некотором предельно ненадежном состоянии. А для Беларуси и Украины, да и для России тоже, у которых чернобыльские родимые пятна еще не прошли и вряд ли когда-то пройдут, даже думать о повторении эксперимента над собой кощунственно.

Георгий ЛЕПИН,
профессор.

ПАЛІТКУХНЯ

Сустрэча з Радаславам Сікорскім

У мінулы аўторак у Варшаве позна ўвечары дэлегацыя Аб'яднаных дэмакратычных сіл сустрэлася з міністрам замежных спраў Радаславам Сікорскім.

Па інфармацыі Міністэрства замежных спраў Польшчы, у складзе беларускай дэлегацыі былі Аляксандр Казулін, Аляксандр Мілінкевіч, Вінцук Вячорка, Віктар Карнеенка, Анатоль Лябедзька і Валерый Ухналёў.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

В суд!

Главным следственным управлением предварительного расследования МВД завершено расследование уголовного дела по обвинению должностных лиц УП "Тета", учредителем которого является минская городская организация ОО "Белорусское общество инвалидов".

Действуя в сговоре с иными соучастниками, они на протяжении 2004—2007 годов занимались хищением и легализацией денежных средств ряда предприятий, сообщила БелаПАН начальник управления информации и общественных связей МВД Светлана Боровская.

Во многих заключенных сделках предприятие "Тета" выполняло роль "финансовой компании" для отмывания денежных средств под предлогом выполнения различного спектра работ (услуг), которые на самом деле в "Тете" не выполнялись. За пределы Беларуси на счета подконтрольных субъектов хозяйствования в Литве, Латвии и России аферисты перечислили не менее 12 млрд рублей, где произошло отмывание по меньшей мере пяти из них.

К уголовной ответственности привлечено восемь человек. Пятеро предстанут перед судом: директор предприятия, двое его заместителей, главный редактор "Настаўніцкай газеты" и его сын. Трое скрылись от следствия и объявлены в розыск. Одна соучастница задержана в Болгарии (сейчас решается вопрос об экстрадиции).

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Чаму на службу міліцыі і КДБ пастаўлены ваенкаматы?

Аб тым, што расследаванне справы аб ліпеньскім выбуху ў Мінску працягваецца, карэспандэнт "Народнай волі" даведаўся ў... ваенкамаце.

Днямі мне прынеслі позву з ваенкамата Першамайскага раёна сталіцы. "Дакумент" уяўляў сабою неахайна абарваны кавалачак паперы, на якім было напісана: "На основании закона Республики Беларусь "О воинской службе" предлагаю Вам явиться в Первомайский районный военный комиссариат по адресу г.Минск, пер.Калининградский 7а, 2-й корпус для уточнения сведений воинского учета".

Засмуціла тое, што ў позве не былі прастаўлены ні дата, ні час, хаця яе аддалі пад роспіс. Вусна паведамілі аб тым, што мяне чакаюць у ваенкамаце 13 кастрычніка з дзевяці раніцы да пяці вечара. І я пайшоў...

Пайшоў, думаючы, што ў ваенкамаце і сапраўды будуць удакладняць нейкія звесткі. Аднак у той дзень з вайскоўцамі ў Першамайскім ваенкамаце сустрэцца не давялося. Мяне, роўна як і ўсіх астатніх, чакалі людзі ў цывільным.

Усіх, хто прыйшоў па позве, накіроўвалі да асобнага ўвахода. Людзей было шмат. Калі надышла мая чарга, убачыў, што ў доўгім ваенкаматаўскім калідоры за трыма сталамі сядзяць нейкія людзі і актыўна запаўняюць нейкія анкеты... Высветлілася, што "рукамі" ваенкамата мяне і іншых запрасілі, каб "адкатаць пальчыкі" — зняць адбіткі пальцаў. "Пра выбух у Мінску чулі? Вось мы і працуем", — коратка паведамілі людзі ў цывільным... "А нашто ж падманвалі пра ўдакладненне звестак?" "Менш размаўляйце!"

Адмаўляцца пакінуць адбіткі я не стаў, хаця меў на гэта законнае права. Але сітуацыя абурыла. І, калі судзіць па размовах з такімі ж, як я, "прызыўнікамі", то не толькі мяне. Што гэта за следства, калі падазраюць усю краіну, калі следчыя дзеянні і экспертызы праводзяць не члены следчай групы, а немаведама хто? Калі людзей запалохваннямі і падманам зацягваюць на следчыя мерапрыемствы.

— Тое, што адбываецца вакол расследавання мінскага выбуху, інакш як імітацыяй назваць нельга, — каменціруе сітуацыю юрыст Ігар Рынкевіч. — Відавочна, што ў следства няма ніякай жыццяздольнай версіі. Што датычыцца правамоцнасці дзеянняў, скіраваных на "адкатванне" пальцаў, то ў законе прапісана, што здача адбіткаў — справа добраахвотная. Выключэнне складаюць толькі людзі, якіх падазраюць у злачынстве. А гэта значыць, што ад "адкатвання" пальцаў усе астатнія могуць адмовіцца.

Тое, што на "службу" міліцыі і КДБ пастаўлены ваенкаматы, яшчэ раз даказвае, што Беларусь — несвабодная дзяржава. Праз ваенкаматы вызываюць тых, да каго нельга дачапіцца праз адміністрацыйныя ці крымінальныя правапарушэнні.

Апошнія падзеі сведчаць, што ў Беларусі запанаваў паліцэйска-жандарскі прынцып і што ёсць указанне атрымаць адбіткі пальцаў літаральна кожнага жыхара краіны. Як я разумею, ствараецца дактыласкапічны банк даных. Па законе, здаваць адбіткі ці не — справа добраахвотная, але сілавікі вырашылі дзейнічаць у абход закона. Любой дзяржаве, калі яна далёкая ад дэмакратыі, важна кантраляваць сваіх грамадзян. А потым кожнага няўгоднага можна будзе часова ізаляваць, сказаўшы, што "на месцы злачынства знойдзены адбіткі пальцаў, вельмі падобныя на вашы"...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ТЫМ ЧАСАМ

Падазроных ва ўчыненні выбуху зноў няма. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства ўнутраных спраў. Нягледзячы на тое, што міліцыя апытала і дапрасіла сотні тысяч (калі не мільёны) людзей; нягледзячы на тое, што былі дзесяткі затрыманых і арыштаваных; нават нягледзячы на абяцанні прадаставіць "праз тры дні" фотаробаты падазроных і хутка раскрыць злачынства... Следства так і не зрушылася ў нейкіх канкрэтных накірунках. Што і казаць, вельмі "прафесійная" работа! Незразумела адно: чаму за яе плацяць такія вялікія заробкі?!

ЧУЛІ?

Арцём Дубскі папрасіў прытулку ва Украіне

Нагадаем, Арцём Дубскі і яшчэ 13 актывістаў маладзёжнай апазіцыі былі асуджаны за ўдзел у акцыі пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў, якая прайшла ў Мінску 10 студзеня 2008 года. Ён быў прыгавораны да абмежавання волі тэрмінам на два гады без накіравання ў папраўчыя ўстановы.

Да ад'езду ва Украіну А.Дубскі жыў у Асіповічах, дзе працягваў займацца грамадзкай дзейнасцю. Пры гэтым да актывіста неаднаразова прыходзілі супрацоўнікі міліцыі, якія гаварылі, што ў гэтым горадзе яму не месца.

"У дачыненні да мяне спрабавалі завесці другую крымінальную справу. Калі гэта зрабіць не ўдалося, да мяне прымянілі прынцып "трох парушэнняў рэжыму". Я вырашыў паехаць ва Украіну і падаў дакументы на атрыманне палітычнага прыстанішча", — паведаміў А.Дубскі.

Паводле інфармацыі актывіста, абвінавачанні ў дачыненні да яго з'яўляюцца цалкам надуманымі. У першы раз супрацоўнікі міліцыі, якія ажыццяўляюць нагляд, прыйшлі дамоў да Дубскага, абвінавацілі яго ў тым, што ён п'яны, даставілі на медыцынскі агляд. Аналіз крыві паказаў, што Дубскі цвярозы, тым не менш пратакол быў складзены. У другі раз сястра Дубскага папрасіла супрацоўнікаў міліцыі разуцца, калі яны аглядалі памяшканне. За гэта ў дачыненні да Дубскага быў складзены пратакол, у якім запісана, што ён не пускаў міліцыю ў сваё жыллё. У трэці раз супрацоўнікі міліцыі агледзелі рукзак Дубскага, калі ён вяртаўся з працы. Праз некалькі дзён Дубскі даведаўся, што ў дачыненні да яго складзены пратакол нібыта за адмову прадэманстраваць змесціва рукзака.

У выніку ў дачыненні да Дубскага распачата справа па арт.415 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі). Пасля гэтага актывіст прыняў рашэнне выехаць ва Украіну.

Паводле слоў асуджанага па гэтай справе Міхаіла Пашкевіча, А.Дубскі — не выключэнне. Некаторыя фігуранты гэтай справы выехалі ў сумежныя краіны, апасаючыся за свой далейшы лёс.

Сяргей ПУЛЬША.

АТЫ-БАТЫ

Палітычны дыягназ?

Мінская абласная ваенная медыцынская камісія прызнала годным да вайсковай службы аднаго з лідэраў маладзёжнага крыла Партыі БНФ Франака Вячорку. Ён выпісаны з ваеннага шпіталя, дзе праходзіў абследаванне. Хлопец прызнаны годным да ваеннай службы "з абмежаваннямі".

16 ліпеня медыцынская камісія ваенкамата Савецкага раёна Мінска прызнала маладзёжнага актывіста непрыгодным да вайсковай службы па стане здароўя (скаліёз і плоскаступнёвасць). Разам з тым абласная медкамісія паставіла пад сумненне гэтае рашэнне і накіравала Франака Вячорку на абследаванне ў ваенны шпіталь.

"Умовы ў ваенным шпіталі былі вельмі добрыя. Усе ставіліся да мяне з прыязнасцю і вельмі ўважліва. Палату не перагружалі, кожную раніцу мяне наведваў урач, які паведамляў, што пра мяне пішуць у інтэрнэце. Сёння сабралася вялікая камісія, якая знізіла на адну ступень дыягназ раённай камісіі і прызнала мяне годным. Пры гэтым мне сказалі, што ад урачоў дыягназ не залежаў — рашэнне было прынята "зверху". Тым не менш мне паведамілі, што я магу абскардзіць яго, — гаворыць Франак. — *Я ўжо не трапляю пад восеньскі прызыў, апрача таго, у мяне яшчэ ёсць адтэрміноўка па зроку. Так што калі мяне і пачнуць забіраць, то толькі зімой. Да гэтага часу я планую абскардзіць дыягназ, прайсці абследаванне ў незалежных урачоў і, калі спатрэбіцца, буду звяртацца ў суд".*

Сяргей ПУЛЬША.

СИТУАЦИЯ

«Сука, когда уймешься?! Это последнее предупреждение»

В Солигорске второй раз избита правозащитница Яна Полякова.

На Яну Полякову напали вечером 9 октября в подъезде ее собственного дома. Правозащитница собиралась отправить по почте жалобу в Генпрокуратуру на постановление прокурора Солигорского района Дмитрия Дешука. В минувших номерах мы рассказывали о том, как накануне парламентских выборов Яна Полякова была избита в отделении милиции. Правозащитница утверждала, что побои ей наносил сотрудник милиции Пугачев: такой была его реакция на нежелание Яны подписывать бумаги, что она отказывается от собранных подписей для регистрации кандидата в депутаты Ольги Козулиной.

Полякова направила в районную прокуратуру жалобу на деятельность участкового милиционера. Прокуратура, несмотря на явные следы побоев, состава преступления в действиях сотрудника милиции, а также оснований для возбуждения уголовного дела не усмотрела. Яна с таким решением не согласилась и обжаловала его в областную прокуратуру. А поскольку ответа оттуда не получила, то написала жалобу Генпрокурору. Именно это письмо Яна собиралась отправить по почте.

— Я уже вышла из подъезда и вспомнила, что забыла деньги, — рассказала "Народной воле" Яна Полякова. — Когда стала открывать входную дверь, услышала, что кто-то подошел сзади. Обернуться не успела, потому

что неизвестный схватил меня за волосы и несколько раз ударил головой о дверь. Я расслышала его угрозы: "Сука, когда уймешься?! Это последнее предупреждение..." Я заскочила в межквартирный коридор и тут же вызвала "скорую".

Медики диагностировали у Яны Поляковой сотрясение мозга и отвезли в травмопункт. Там ей оказали первую помощь, после чего доставили в РОВД для составления заявления по факту избиения.

— В милиции мне стало плохо, я хотела выйти на свежий воздух, — продолжает свой рассказ правозащитница. — Однако один из сотрудников схватил меня за кофту и так дернул, что я оказалась на полу. Мне кажется, он применил какой-то силовой прием, потому что встать я не могла. До сих пор чувствую боль в позвоночнике и на ногу не могу наступить.

Но снова обращаться за помощью к медикам, говорит Яна, она опасается. И объясняет почему:

— После "милицейского приема" ночью мне снова стало плохо, наверное, прошло действие обезболивающего препарата. Под утро открылась сильная рвота, и снова пришлось вызвать "скорую". Врач опять посоветовал госпитализацию, и в районе 5 часов утра меня доставили в Солигорскую районную больницу. Но не успели меня осмотреть травматолог и невропатолог, как в кабинет буквально влетел милиционер, который накануне отрабатывал на мне силовой прием. Он заявил, что пришел меня опросить по факту избиения в подъезде. Представляете, опросить в 5 утра! Откуда он узнал, что я нахожусь именно в больнице? У меня есть основание считать, что проинформировали его врачи "скорой". И вообще, что это за методы работы? Меня хотят еще больше напугать?! Не буду скрывать, вся эта ситуация меня настораживает, но из города я не уеду и буду добиваться рассмотрения моих жалоб.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Леанід ЛЫЧ, доктар гістарычных навук, прафесар



Праваслаўная царква ў Беларусі: калі яна скіне путы Масквы?

А ў нас жа была самастойная царква

Спакон вякоў разумныя людзі лічылі: каб рэальна забяспечыць нацыянальны суверэнітэт краіны, гэтай высакароднай мэце павінен адпавядаць увесь змест царкоўна-рэлігійнага жыцця. Яскравым прыкладам такога светапогляду можа служыць дзейнасць вялікага князя літоўскага Вітаўта, з імем якога звязана ўтварэнне ў 1415 годзе на нашай зямлі самастойнай праваслаўнай мітраполіі з цэнтрам у Наваградку. Узначаліў яе, па просьбе самога Вітаўта, адукаваны праваслаўны царкоўны дзеяч — балгарын Грыгорый Цамблак. Прычым адбылося такое без дазволу канстанцінопальскага патрыярха і насуперак жаданню духоўных і свецкіх уладаў Маскоўскага княства. У Вітаўта было вялікае жаданне зрабіць царкву сваёй краіны незалежнай ад любой з мітраполій.

Дамагчыся такой мэты аказалася зусім не проста. У няспыннай барацьбе маскоўскіх і наваградскіх царкоўных іерархаў за статус мітрапаліта "киевского и всея Руси" канстанцінопальскі патрыярх звычайна падтрымліваў першых. Каб не апынуцца пад юрысдыкцыяй Маскоўскай мітраполіі (афіцыйна яна так стала называцца з 1459 года), кіраўніцтва праваслаўнай царквы ВКЛ усё больш пачало схіляцца да ідэй Фларэнтыйскай уніі 1439 года аб аб'яднанні на роўных умовах з каталіцкім касцёлам.

Лагічным вынікам барацьбы за права ладзіць царкоўную дзейнасць самастойна, незалежна ад каго б там ні было, стала канчатковае аддзяленне ў 1458 годзе Літоўска-Наваградскай мітраполіі (тагачасная афіцыйная назва — Кіеўская мітраполія) ад Масквы. Як бачым, сёлета спаўняецца роўна 550 год гэтай важнай падзеі ў гісторыі станаўлення аўтакефаліі праваслаўнай царквы Беларусі. Аддзяленне адбылося ў час, калі Літоўска-Наваградскую мітраполію ўзначальваў Грыгорый Балгарын. Хоць ён быў сынам іншага славянскага народа, але разумеў, што для ВКЛ пры частых канфліктах, войнах з Маскоўскім княствам патрэбна незалежная ад яго духоўных улад праваслаўная царква. Канстанцінопальскі патрыярх падтрымаў гэтую ініцыятыву, за што Масква разарвала свае дачыненні не толькі з ім, але і з Кіеўскай мітраполіяй.

Сур'ёзная пагроза незалежнаму царкоўна-рэлігійнаму жыццю на нашых землях узнікла пасля аб'яднання ў 1569 годзе Вялікага княства Літоўскага з Каронай Польскай у адну федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Супрацьстаяць агрэсіўнаму каталіцызму польскага ўзору верагодна можна было б, калі б не менш агрэсіўныя прэтэнзіі Маскоўскай мітраполіі на ўладу над праваслаўным насельніцтвам ВКЛ. Гэтыя прэтэнзіі асабліва ўзмацніліся пасля абвяшчэння Маскоўскай мітраполіяй сябе ў 1589 годзе патрыярхіяй. Адбылося тое без згоды канстанцінопальскага патрыярха. Нежаданне быць праглынутай Маскоўскай патрыярхіяй сталася адной з важных падстаў для вярхоў праваслаўнага духавенства ВКЛ і Украіны пайсці ў 1596 годзе на падпісанне Берасцейскай царкоўнай уніі. Яна ў пэўнай ступені затармазіла працэсы акаталічвання беларусаў, перашкаджала распаўсюджванню над імі улады Маскоўскай патрыярхіі. Але з падзеламі Рэчы Паспалітай у 1772, 1793 і 1795 гадах, гвалтоўным уключэннем у склад Расійскай імперыі амаль усіх нашых земляў уніяцкая царква апынулася ў надзвычай цяжкім, безнадзейным становішчы. Яе вернікаў перацягвалі, кожная да сябе, праваслаўная і каталіцкая канфесіі. Апошнім годам афіцыйнага існавання на Беларусі уніяцкай царквы стаў 1839 год. Ліквідавалі яе гвалтоўна, адміністрацыйным шляхам.

У канфесійным плане наш народ аказаўся самым сірочым у Еўропе. Толькі ў яго не аказалася ўласнай канфесіі: праваслаўная царква ў гэтым краі адстойвала рускі інтарэс, каталіцкі касцёл — польскі. Такая неадпаведнасць царкоўнай дзейнасці беларускаму нацыянальнаму ідэалу надзвычай негатыўна адбілася на лёсе людзей, аднак у прагрэсіўнай часткі грамадства не вытруціла жадання стаць канфесійна незалежнымі як ад Масквы, так і ад Варшавы. Не будзь такога заканамернага жадання, у створанай у 1919 годзе са згоды бальшавікоў Беларускай савецкай сацыялістычнай рэспубліцы (БССР) не ўзнікла б ідэя аб заснаванні Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (БАПЦ). Прычым выспела гэтая прагрэсіўная ідэя ў асяроддзі мясцовага праваслаўнага духавенства. Як і многія іншыя нацыянальна арыентаваныя колы беларускага грамадства, праваслаўныя іерархі спадзяваліся, што БССР некалі стане па-сапраўднаму суверэннай дзяржавай, чаму і садзейнічала б наяўнасць у яе сваёй уласнай незалежнай царквы.

Для маладой БССР першым крокам да такой царквы стала абранне ў 1922 годзе на Менскім епархіяльным з'ездзе беларускім мітрапалітам Мелхіседэка (у свеце — Міхаіл Паеўскі). Родам ён з Канстанцінаўскага павета (Польшча), дзе ў куды меншай ступені, чым у цэнтральнай частцы Беларусі, адчуваўся ўплыў русіфікацыі. Будучы выкладчыкам Магілёўскай духоўнай семінарыі, настаяцелем Магілёўскага брацкага манастыра, Бяльніцкага і Херсонскага, Уладзімірскага манастыроў, епіскапам таўрычаскім, архіепіскапам астраханскім, ён набыў багаты прафесійны вопыт, які дапамог годна выконваць абавязкі вікарнага епіскапа слуцкага, епіскапа мінскага і тураўскага. Тым болей, што ён быў зарыентаваны на беларускі нацыянальны інтарэс.

Дарэчы, ідэя царкоўнай незалежнасці з'яўлялася досыць папулярнай і сярод епархій той часткі насельніцтва беларускай этнічнай тэрыторыі, якая да вясны 1924 года знаходзілася ў складзе Расійскай Федэрацыі. Як толькі гэтую тэрыторыю вярнулі БССР, тут адразу была ўтворана Беларуская аўтаномная праваслаўная царква. Яна аб'ядноўвала беларускія епархіі абнаўленчай царквы, якая ў пачатку 20-х гадоў выйшла з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату, мела падтрымку ад савецкай улады за свае прыхільнасць да сацыялістычнага ладу жыцця. У канцы 20-х гадоў у Беларускую аўтаномную праваслаўную царкву ўваходзіла да 500 парафій. На жаль, з прычыны моцнай зрусіфікаванасці і вернікаў, і праваслаўнага духавенства гэтых размешчаных пераважна ва ўсходніх раёнах БССР парафій яны не пакінулі адметнага следу ў беларусізацыі царкоўна-рэлігійнага жыцця. Свой галоўны друкаваны орган гэтая царква выдавала на рускай мове пад назвай "Белорусский православный вестник".

Не выключана, што менавіта адсутнасць у гэтай царквы яркага акрэсленай накіраванасці на беларускі інтарэс дазволіла ёй працягнуць сваю дзейнасць да 1934 года, чаго не ўдалося Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царкве. Шчырага прыхільніка аўтакефальнай ідэі Мелхіседэка ўжо ў 1925 годзе ў Менску на адкрытым палітычным працэсе прыгаварылі да трох гадоў зняволення ўмоўна. Куды больш строга паставілася да яго Масква: у тым жа годзе іерарха арыштоўваюць і высылаюць на пасяленне ў далёкі Краснаярскі край, адкуль ён ужо не вярнуўся. Ідэю аўтакефаліі ў 1927 годзе давялі да лагічнага канца яго надзейныя прыхільнікі. Як след разгарнуць сваю дзейнасць БАПЦ не змагла, бо з 1929 года ў савецкай краіне шырока разгарнулася барацьба з рэлігіяй.

Развязванню праблем аўтакефаліі ў Беларусі імкнуліся дапамагчы нашы супляменнікі з-за мяжы. На такіх пазіцыях стаяла і рэдакцыя ковенскага беларускамоўнага часопіса "Крывіч", які выходзіў у 1923—1927 гадах пад рэдакцыяй шчырага прыхільніка аўтакефальнай царквы, вядомага ідэолага беларускага нацыянальнага Адраджэння Вацлава Ластоўскага. Адсутнасць цэнзуры дазваляла аўтарам выказваць на старонках перыядычнага выдання смелыя думкі. Пастараўся выкарыстаць гэтую нагоду і беларускі этнограф, фалькларыст, супрацоўнік Інстытута беларускай культуры Аляксандр Шлюбскі. У дзевятым нумары часопіса за 1925 год ён палымяна пісаў: *"...тыя беларусы, у душы якіх сільнейшая нацыянальная сьвядомасьць за ўсякую гістарычную шалуду, павінны ўсімі сіламі імкнуцца да ўтварэньня беларускай аўтакефальнай царквы. Мы павінны рваць і з Рымам, і з Масквою і тварыць сваю ўласную нацыянальную царкву".*

З Рымам савецкая ўлада не толькі дазваляла, але і дапамагала "рваць", а вось што датычыла Масквы, ад яе Беларусь станавілася ўсё больш і больш залежнай па ўсіх накірунках эканамічнага, палітычнага і духоўнага жыцця, што добра адчуў на сабе і аўтар вышэйпрыведзенай цытаты: у 1930 годзе ён быў арыштаваны савецкімі рэпрэсіўнымі органамі, нават месца заканчэння яго зямнога жыцця засталося невядомым...

Рух за царкоўную незалежнасць не спыніла і фашысцкая акупацыя

Ідэя аўтакефаліі не згасла і ў чорныя гады нямецкай акупацыі, што сведчыць пра вялікую папулярнасць гэтага памкнення сярод вернікаў. Дзеля гэтага стараліся не толькі духоўныя асобы, а і грамадскія колы нацыянальнай арыентацыі. Хаця, вядома, у акупантаў былі зусім іншыя планы, чым стварэнне па-сапраўднаму суверэнных дзяржаў на захопленай тэрыторыі.

Для шчырых прыхільнікаў незалежнай ад Маскоўскага патрыярхату Беларускай праваслаўнай царквы не з'яўлялася сакрэтам, як цяжка будзе здзейсніць нацыянальна-патрыятычную задуму і з-за панавання ў асяроддзі святарства моцнага прарускага элемента. Самым зацятым праціўнікам ідэі аўтакефаліі быў мітрапаліт Мінскі і ўсяе Беларусі Панцеляймон (у свеце — Ражноўскі). Кіраўнік праваслаўнай царквы Беларусі быў рускім не толькі паходжаннем, але і духам. Усё беларускае было для яго чужым і далёкім. Хаця ўпершыню да нас ён трапіў яшчэ ў 1906 годзе, заняўшы пасаду настаяцеля Маркава манастыра ў Віцебску, аднак і за вялікі адрэзак часу не навучыўся жыць паводле яе нацыянальна-культурных традыцый, карыстаўся выключна толькі рускай мовай.

Служба на ніве рускага праваслаўя адмоўна паўплывала на нацыянальную самасвядомасць епіскапа беларускага паходжання Філафея (у свеце — Нарко; нарадзіўся ў 1905 годзе на тэрыторыі сучаснага Мядзельскага раёна).

Упартае нежаданне мітрапаліта Панцеляймона беларусізаваць царкву, поўная бяздзейнасць епіскапа Філафея ў вырашэнні архіважнай праблемы вымусілі прыхільнікаў аўтакефаліі звярнуцца з адпаведным мемарандумам да самога Генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ. Прапаноўвалася нават "неадкладна адсунуць мітрапаліта Беларускай мітраполіі" і "перасяліць яго з Менска ў Жыровіцкі манастыр". Справа, аднак, да гэта не дайшла, затое Панцеляймон нарэшце пагадзіўся, што *"пропаведзі й навука закона Божага павінны адбывацца на беларускай мове".*

Інакш як парадоксам гэтую з'яву не назавеш: за час знаходжання Беларусі пад уладай Расійскай імперыі нават і слова не было сказана пра беларускую мову ў набажэнстве... Праўда, і ва ўмовах нямецкай акупацыі не ўдалося ўкараніць нашу мову ў царкоўнае жыццё з-за моцнага супраціву гэтаму зрусіфікаванай часткі праваслаўнага духавенства.

Мітрапаліт Панцеляймон усяляк падтрымліваў працяўнікаў незалежнай для Беларусі царквы. Не ўтойваў свайго адмоўнага стаўлення да аўтакефаліі і епіскап брэсцкі Венядыкт (Бабкоўскі). Паколькі ў канцы 1941 года Брэсцкая епархія адышла пад юрысдыкцыю Украінскай праваслаўнай царквы, яго прызначылі выконваць абавязкі епіскапа гродзенскага і беластоцкага.

Але падзеі ў акупіраванай Беларусі адбываліся так, што заканамернага імкнення да аўтакефаліі царквы не магло стрымаць адмоўнае стаўленне да гэтай ідэі высокіх праваслаўных кіраўнікоў. Правядзенне яе ў жыццё ініцыявалася і існаваннем на захад ад Беларусі Праваслаўнай аўтакефальнай царквы ў Генерал-губернатарстве (з цэнтрам у Кракаве), пад юрысдыкцыяй якога знаходзілася большая частка польскіх земляў. Архіепіскапам варшаўскім і мітрапалітам Праваслаўнай аўтакефальнай царквы ў Генерал-губернатарстве быў Дзіанісій (Дзяніс). Гэта з яго дазволу на царкоўную працу па просьбе Панцеляймона прыбылі з Варшавы ў Беларусь архімандрыты Філафей (Нарко) і Апанас (Мартас). Неўзабаве першы з іх быў узведзены ў сан епіскапа і ўзначаліў Слуцкую епархію. Гэта ўжо быў другі пасля Венядыкта епіскап Беларускай праваслаўнай царквы. Апанас жа працягваў заставацца ў чыне архімандрыта. Калі 3 сакавіка 1942 года ў Мінску праходзіў Сабор БПЦ, ён меў толькі дарадчы голас. На гэтым жа саборы яго прызначаюць на кафедру епіскапа віцебскага і полацкага. Паколькі з прычыны ваенных дзеянняў было немагчыма заняць гэтую пасаду, яму даручылі ўзначаліць Наваградска-Баранавіцкую епархію, у якой адсутнічаў кіраўнік. Роўна праз пяць дзён у Спаса-Прэабражэнскай царкве Мінска архімандрыта Апанаса Мартаса ўзвялі ў сан епіскапа.

Такая важная падзея не засталася незаўважанай рэдакцыяй "Беларускай газэты", якая выказвала да яго просьбу "як найхутчэй узяць пад увагу на поўную беларусізацыю царквы. Гэтая беларусізацыя можа быць толькі тады, калі ў кожным прыходзе за настаяцеля будзе свядомы беларускі патрыёт". Выказвалася ўпэўненасць, што, "працуючы на нацыянальнай беларускай ніве, праваслаўнае духавенства будзе тым цэмэнтам, што змацняе беларускую нацыю".

Аднак дамагчыся таго было няпроста ва ўмовах вайны і з прычыны перавагі ў складзе святароў асоб прарускай і прапольскай арыентацыі. Росту колькасці апошняй катэгорыі садзейнічала, як вядома, паланізатарская палітыка ўлад Другой Рэчы Паспалітай. Яны добра пастараліся на ўмацаванне польскага фактару ў праваслаўным набажэнстве, што, між іншым, было зусім не ў яго традыцыях. Улады хутчэй былі гатовы дазволіць дзейнасць праваслаўнай царквы ў адпаведнасці з рускімі, чым беларускімі культурна-моўнымі традыцыямі. Рабілася ж такое з адзінай мэтай: усяляк перашкаджаць росту нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Усталяваныя фашыстамі органы ўлады асабліва не перашкаджалі гульням у беларускую незалежнасць. У створанай на пачатку 1942 года Беларускай незалежніцкай партыі (БНП) мелася нямала гарачых прыхільнікаў аўтакефальнай праваслаўнай царквы, бо разглядалі яе ў якасці дзейснага сродку для дасягнення палітычнай незалежнасці. У іх было вялікае жаданне вызваліць нашую праваслаўную царкву ад падначалення Маскоўскага патрыярхату з-за яго ўпартага нежадання ўлічваць гістарычныя і нацыянальна-культурныя традыцыі беларускага народа. Нягледзячы на ўсю экстрэмальнасць жыцця пад акупацыяй, спрадвечная мара мець аўтакефальную праваслаўную царкву многім здавалася не такой ужо і няздзейснай.

Дзеля падрыхтоўкі людзей да кардынальных перамен у іх рэлігійным жыцці выкарыстоўваўся патэнцыял дазволенага акупантамі перыядычнага друку. "Беларуская газэта" на чале з Уладзіславам Казлоўскім, добра вядомым у міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі як беларускі грамадска-палітычны дзеяч, паэт і публіцыст, выказвала меркаванне, што Руская праваслаўная царква больш зрабіла па русіфікацыі беларускага народа, чым чыноўніцкі апарат. "Праваслаўныя прапаведнікі на Беларусі, — чытаем у адным з артыкулаў гэтай газеты, — з мэтаю хутчэйшай русіфікацыі называлі праваслаўную веру "рускай". Атуманеная гэткай пастановай беларускае праваслаўнае жыхарства памяшала ў свой час рэлігію з нацыянальнасьцей".

Але... З усіх трох епіскапаў ідэю незалежнасці праваслаўя на Беларусі напачатку больш-менш падзяляў толькі Апанас Мартас. Адкрыта выступаць за яе не адважваўся з-за ўпартага супраціўлення мітрапаліта Панцеляймона і заўзятага русафіла епіскапа, а затым і архіепіскапа Венядыкта. Такі сан займеў і Філафей, якога выбралі заступнікам мітрапаліта Панцеляймона. Трэба сказаць, што ўладыка Філафей, асоба беларускага паходжання, вельмі ўважліва сачыў за ўсім, што адбывалася ў нацыянальна-культурным жыцці роднага краю. Ён нават дазваляў сабе дзе-нідзе выяўляць супраціў русафільскім захадам мітрапаліта. Дзякуючы перш за ўсё намаганням Філафея і Мартаса Панцеляймон пагадзіўся прызначыць на кафедру епіскапа смаленскага і бранскага Сцяпана Сеўбу, які трымаўся беларускай арыентацыі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

Праваслаўная царква ў Беларусі: калі яна скіне путы Масквы?

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Абвясціць лягчэй, чым спраўдзіць

Упартае нежаданне Панцеляймона склікаць Сабор для абвяшчэння аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай царквы сталася прычынай выдання 1 чэрвеня 1942 года Генеральным камісарыятам Беларусі загаду аб яго высяленні з Менску і накіраванні ў манастыр Ляды (на тэрыторыі сучаснага Смалявіцкага раёна). Справы па кіраванні Беларускай праваслаўнай царквой ён перадаў архіепіскапу магілёўскаму і мсціслаўскаму Філафею. Пазней яму ж мітрапаліт даручыў адкрыццё царкоўнага сабора, на якім павінна было разглядацца пытанне аўтакефаліі БПЦ.

Сабор адкрыўся 30 жніўня 1942 года ў Спаса-Прэабражэнскай царкве ў Менску. Складанае становішча ў акупіраванай Беларусі не дазволіла забяспечыць Сабору шырокую прадстаўнічасць. Колькасна пераважалі прадстаўнікі ад міран. Старшынствааў на Саборы са згоды мітрапаліта Панцеляймона архіепіскап Філафей. Рабочай мовай Сабора была беларуская, што вельмі рэдка назіралася ў практыцы праваслаўнай царквы нашай краіны. (Вялікая недарэчнасць, што яна не з'яўляецца нормай і сёння.)

На адрас Сабора прыйшлі прывітанні. Паводле ацэнкі Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні, "Сьвяшчэнны Беларускі Сабор у нашай сталіцы, — гэта гістарычны акт у гісторыі нашай Царквы, якая, нарэшце, скіне путы чужынскіх уплываў выключна з палітычных мэтаў, трымаўшых Царкву ў няволі". Беларускае праваслаўнае грамадзянства і духавенства Вільні, адзначалася ў прывітанні, узносяць "свае гарачыя малітвы да ўсявышняга, каб Ён дапамог давесьці да пажаданага выніку вялікую й сьвятую справу — урэгуляваньне нашае Царквы на тэрыторыі Беларусі. Дзень 28 жніўня 1942 г. (меркавалася, што ў гэты дзень адбудзецца абвяшчэнне Беларускай аўтакефальнай царквы. — Л.Л.), як і Дзень 25 сакавіка 1918 г., увойдзе ў гісторыю нашае Царквы і нашага народу як найвялікшае свята... Беларусь будзе мець сваю нацыянальную незалежную Аўтакефальную Царкву. Царква перастане быць аружжам у руках нашых ворагаў дзеля русіфікацыі або паланізацыі нашага народа. І нарэшце атрымае магчымасьць выконваць свае заданьні: выхоўваць верных у хрысьціянскім духу і добрых сыноў сваёй бацькаўшчыны".

У пэўнай ступені можа здзіўляць аднагалоснае прыняцце Саборам Статуту БАПЦ. Пэўна, не зразумець гістарычнай неабходнасці мець на Беларусі незалежную нацыянальную царкву маглі толькі абмежаваныя ў сваім культурным развіцці, безнадзейна хворыя на нацыянальны нігілізм дэлегаты. На шчасце, такіх не аказалася на Саборы...

У прынятым на Саборы Статуце БАПЦ была выказана найвялікшая павага да беларускай мовы. Адзначалася, што яе абавязкова належыць выкарыстоўваць у царкоўнай пропаведзі, навучанні рэлігіі, вядзенні справаводства, рэлігійнай літаратуры. Прызнавалася таксама неабходнасць надаваць перавагу беларусам пры камплектаванні кіраўнічых царкоўных пасад...

Ды, вядома, бывае, што нават аднагалосна ўхваленыя рашэнні не заўсёды належным чынам выконваюцца тымі, хто іх прымаў. Бюракратычная машына і ў царкоўных нетрах круціцца павольна. Доўга не высыналіся лісты да кіраўнікоў праваслаўных аўтакефальных цэркваў, просьба Сабора да ўсяленскага канстанцінопальскага патрыярха аб выдачы Томасу на аўтакефалію Беларускай праваслаўнай царквы.

Да таго ж ваенныя падзеі стваралі сур'ёзныя цяжкасці для перасылкі дакументаў на афармленне аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай царквы. Але вырашальным аказалася хутка праведзеная хіратонія ў епіскапы асоб непахіснай прарускай арыентацыі.

І першая скрыпка ў абароне рускага аблічча праваслаўнай царквы Беларусі належыць, несумненна, ужо не раз згаданаму мітрапаліту Панцеляймону.

Пры канчатковым вырашэнні пытання аб увядзенні аўтакефаліі на Беларусі аб'яднаным сілам Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы і Маскоўскага патрыярхату, напэўна ж, удалося б схіліць на свой бок і ўсяленскага канстанцінопальскага патрыярха. Але справа да гэтага не дайшла: на свой адрас ён не атрымаў неабходных дакументаў ад кіраўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы.

І не з прычыны выкліканага вайной неспрыяльнага становішча ў свеце. Галоўная прычына знаходзілася ўнутры, у самым высокім асяроддзі праваслаўнага духавенства Беларусі. На пэўныя ўступкі справе аўтакефаліі мітрапаліт Панцеляймон заўжды ішоў з вялікім нежаданнем і пад прымусам беларускага нацыянальнага актыву, на баку якога стаяў генеральны камісар Генеральнай акругі Беларусь Вільгельм Кубэ.

Марна было б спадзявацца, што некалі гэтая дзейнасць скіруецца на беларускі нацыянальны інтарэс, прывядзе да стварэння аўтакефальнай праваслаўнай царквы.

Пасля забойства 22 верасня 1943 года В.Кубэ менскімі падпольшчыкамі яго пераемнік фон Готберг ужо не выказваў асаблівай зацікаўленасці да рэлігійнага пытання на Беларусі. Не апраўдаў надзеі беларускіх нацыянальных патрыётаў на давядзенне да канца справы стварэння БАПЦ і заступнік Панцеляймона архіепіскап Філафей. Яго дваістая гульня ў беларускую аўтакефалію дорага абышлася ёй. Трохі пазнавата зразумеў гэта і такі высокапрафесійны палітычны дзеяч, як Радаслаў Астроўскі. З-за моцнага супраціву зрусіфікаванага кіраўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы ідэі аўтакефаліі яму так і не ўдалося замяніць Філафея епіскапам смаленскім і бранскім Сцяпанам, які на сваёй пасадзе нямала зрабіў для беларускай справы.

Нельга не звярнуць увагу на такую акалічнасць: калі Філафей у якасці старшыні Аўтакефальнага сабора Беларускай праваслаўнай царквы выступаў у Менску 27 чэрвеня 1944 года на Другім усебеларускім кангрэсе, ён і слова не сказаў пра рэальны стан з аўтакефаліяй. Праўда, прыхільна былі сустрэты яго выказванні: "Калі ідзе аб змаганьні з бальшавізмам, дык трэба ведаць, што хрысьціянская культура з'яўляецца найбольшым ворагам бальшавізму. У барацьбе за лепшую долю трэба вырабіць сьветапогляд працўны бальшавізму — сьветапогляд хрысціянскай культуры". А вось пра ролю ў ёй беларускага пачатку ні слова! Несумненна, Філафей быў прыхільнікам традыцый, навязаных праваслаўнай царкве Беларусі Свяшчэнным сінодам і Маскоўскім патрыярхатам, не ўяўляў хрысціянскай культуры ў нашым краі іншай, як толькі пабудаванай на рускіх стандартах. Затое на тым жа Кангрэсе ксёндз Пётр Татарыновіч, вядомы яшчэ як грамадскі і культурны дзеяч Заходняй Беларусі, запэўніў дэлегатаў, што каталіцкае духавенства "пацьвярджае сваё супрацоўніцтва ў беларускай адраджэнскай працы" (падкрэслена мною. — Л.Л.).

Бывай, аўтакефалія! Няхай жыве аўтакефалія!

Хаця практычна кіраўніцтва праваслаўнай царквы ў акупаванай Беларусі адстойвала ў сваёй дзейнасці рускі інтарэс, яшчэ да пачатку вызвалення нашай тэрыторыі савецкімі войскамі яно ў спешным парадку падалося на Захад, чамусьці не ўзяўшы з сабою нічога ад нялюбай імі аўтакефаліі... Знайшоўшы прытулак у Заходняй Нямеччыне, мітрапаліт Панцеляймон разам з архіепіскапам Філафеем, архіепіскапам палескім і брэсцкім Іаанам і ўсімі астатнімі іерархамі свае намаганні скіроўвалі галоўным чынам на тое, як уліцца ў блізкую ім па духу Рускую замежную праваслаўную царкву. Адбылося такое ў 1946 годзе. У адказ на гэта адданыя беларускаму нацыянальнаму інтарэсу святары і вернікі — эмігранты пачалі рабіць практычныя захады па стварэнні аўтакефальнай царквы. Днём народзінаў яе стала 5 чэрвеня 1948 года, месцам народзінаў — Канстанта (Заходняя Нямеччына, былая французская зона акупацыі). Гэта адыграла велізарную ролю не толькі ў царкоўна-рэлігійным жыцці, але і ў лёсе беларускай дыяспары ў цэлым. БАПЦ за мяжой была і застаецца шчыра адданай беларускім ідэалам, за што яе з поўнай падставай можна называць нацыянальнай царквой.

Не жадаючы і пасля вайны лічыцца з беларускім інтарэсам, Маскоўская патрыярхія мэтанакіравана і рашуча распраўлялася з усім, што нагадвала пра існаванне ў час ліхалецця Беларускай праваслаўнай аўтакефальнай царквы. Усіх, хто хоць трохі меў дачыненне да яе, пазбавілі працы. Архіепіскапам на Беларусь быў прысланы рускі па паходжанні Піцірым (у свеце — П.Свірыдаў).

Аднак нацыянальна зарыентаваныя праваслаўныя вернікі ў нашай краіне не могуць адмовіцца ад думкі пра неабходнасць аўтакефальнай царквы ў сябе дома. Гэта цалкам вялікай гістарычнай важнасці ідэя будзе набываць усё большую папулярнасць разам з узмацненнем нацыянальнай свядомасці грамадзян, іх жадання мець ва ўсіх дачыненнях рэальна незалежную дзяржаву. Дасягнуць жа такога ва ўмовах поўнага падпарадкавання Маскоўскаму патрыярхату самай масавай хрысціянскай канфесіі Беларусі складана. Не без ўздзеяння Маскоўскага патрыярхату кіраўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы не бачыць у беларусах самастойнага этнасу, атаясамлівае іх з рускімі, не хоча пусціць родную мову тытульнага народа ў свае храмы, выкарыстоўваць яе ў працы з вернікамі.

Супрацьлеглае стаўленне да гэтага мае Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква за мяжой. У канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў яе кіраўніцтва не раз уступала ў дыялог з вернікамі мітраполіі, віншавала іх з нагоды розных рэлігійных святаў, тлумачыла, як важна быць народам са здаровай нацыянальнай самасвядомасцю. Вось, для прыкладу, вытрымка з "Велікоднага вітання Ізяслава (1926—2007), мітрапаліта першаіерарха Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы" (1991 г): *"Усе беларусы павінны ўсвядоміць, што існаванне нашай нацыі немагчыма без нацыянальнай царквы. Гэтакаю нацыянальнаю, незалежнаю звонку царквою не можа быць ніякая чужынская юрысдыкцыя, а толькі Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква"*.

З гэтым нельга не пагадзіцца.

Дзе ж логіка?

Ідэя аўтакефаліі ў нашым краі можа спраўдзіцца толькі пры пэўных умовах. Па-першае, калі кіраўніцтва праваслаўнай царквы станецца здольным будаваць сваю дзейнасць у поўнай адпаведнасці са спрадвечнымі беларускімі гістарычнымі і культурнамоўнымі традыцыямі, не выцясняючы іх рускімі адпаведнікамі, як гэта робіцца па сённяшні дзень. Па-другое, калі палітычныя ўлады не на словах, а на справе будуць імкнуцца да поўнай дзяржаўнай незалежнасці Беларусі, што немагчыма пры такім падпарадкаванні яе самай масавай канфесіі — Маскоўскаму патрыярхату.

Неспрыяльнае сёння для нацыянальных інтарэсаў грамадска-палітычнае і царкоўна-рэлігійнае становішча на Беларусі не выключае актуальнасці ідэі аўтакефаліі на перспектыву. Цывілізаваны свет развіваецца ў напрамку дэмакратызацыі і культурнай разнастайнасці грамадскага жыцця. Прагрэсіўныя сілы рашуча асуджаюць любыя дзеянні, скіраваныя на асіміляцыю ўжо сцверджаных у сваім нацыянальна-культурным статусе народаў, прыходзяць ім на дапамогу, каб не даць загінуць этнічнай смерцю перад разбуральнымі наступствамі сусветнай глабалізацыі. Супрацьстаяць жа такой бядзе добра можа дапамагчы аўтакефальная праваслаўная царква, бо пры арганізацыі сваёй дзейнасці яна арыентуецца на нацыянальныя традыцыі ўласных прыхаджан, а не на культурнамоўныя каноны краіны знаходжання патрыярхату, як гэта заўжды практыкавала і сёння практыкуе залежная ад Маскоўскай патрыярхіі Беларуская праваслаўная царква.

Калі нашы папярэднікі ўзяліся за пераўвасабленне ідэі аўтакефаліі ў самы цяжкі для Бацькаўшчыны час — гады фашысцкай акупацыі, дык чаму ж не задумацца над гэтым зараз, калі наша краіна стала суверэннай дзяржавай? У ёй усё павінна быць незалежным, у тым ліку і царква. Час нарэшце зразумець, што ў падпарадкаванні Маскоўскаму патрыярхату больш палітычнага, замешанага на рускім вялікадзяржаўным шавінізме, чым па-сапраўднаму царкоўна-рэлігійнага.

Нават пры самым павярхоўным поглядзе на сучасны стан рэчаў выразна бачыцца такая неадпаведнасць: у палітычным плане Рэспубліка Беларусь — суверэнная краіна, а ў царкоўных дачыненнях цалкам залежная ад суседняй дзяржавы — Расійскай Федэрацыі. Дзе ж логіка, дзе здаровы сэнс?

ПРАПАНОВА

Пенсіі — усім па адным законе

Я згодзен амаль з усімі аўтарамі, якія абмяркоўваюць на старонках "Народнай волі" праблему пенсіённага забеспячэння. Сапраўды, трэба каб пенсіі налічваліся ўсім па адным законе. Аляксандр Лукашэнка павінен тэрмінова адмяніць той указ, якім ён надзяліў прыбліжаных чыноўнікаў льготнымі заахвочваннямі. Усім відавочна, што зрабіў ён гэта дзеля таго, каб чалавек, які ўзняўся на высокую службовую ступень, лаяльна ставіўся да яго палітыкі. Нягледзячы на тое, прыносіць яна карысць краіне, грамадству ці не. Адным словам, хочаш мець пенсію памерам болей за два мільёны рублёў — прыслужвай!

Атрымалася так: Народны паэт Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета некалькіх скліканняў Ніл Гілевіч мае пенсію ў два разы меншую, чым, скажам, нейкі дэпутат Палаты прадстаўнікоў, ад якога за чатыры гады выбаршчыкі слова не пачулі. Чаму такая дыскрымінацыя аднаго і такое азалачэнне другога? Таму, што Ніл Сымонавіч і ў савецкія часы, і пазней трымаўся прынцыповай пазіцыі, а лукашэнкаўскі дэпутат — толькі лукашэнкаўскай.

Нельга змірыцца з тым, што прэзідэнт мае магчымасць адкрыта, скажам, займацца подкупам тых жа дэпутатаў. Таму я прапаную тэрмінова распрацаваць і прыняць новы закон па пенсіённым забеспячэнні. Пры гэтым трэба неадкладна адмяніць усе ўказы, якія дыскрымінуюць абсалютную большасць насельніцтва і неабгрунтавана прадастаўляюць велізарныя пенсіі тым чыноўнікам, якія прагіналіся перад уладай.

Максім КРАСУЦКІ, пенсіянер.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

Падаражэла ўсё

Гляджу на свой кашалёк і нічога не магу зразумець. Кажуць, у краіне ўсё добра, кажуць, што даходы нашы не паменшыліся, кажуць, што з інфляцыяй урад змагаецца паспяхова. Чаму ж я з сям'ёй не магу тыдзень пражыць на 100 тысяч рублёў, хаця ў мінулым годзе мне хапала?

Валянціна КРУПСКАЯ, г.Мінск.

Спадарыня Валянціна, чаго каштуе беларускі "эканамічны цуд", вы сапраўды адчулі на сваім кашальку. Словы, як кажуць, і ёсць словы, іх есці не будзеш... І што б ні гаварылі афіцыйныя прапагандысты, цэны падскочылі і вельмі значна.

Вось дадзеныя Галоўнага статыстычнага камітэта Мінска па росце кошту асобных груп тавараў у параўнанні з вераснем мінулага года:

алей — рост склаў 83%;
макаронныя вырабы — 34,4%;
масла — 33,8%;
маргарын — 29,8%;
малако і малочныя прадукты — 29,4%;
крупы і бабовыя — 27,5%;
мука пшанічная — 23,2%;
сыры цвёрдыя — 20,9%;
мяса і птушка 20%;
кандытарскія вырабы — 16,9%;
каўбасы — 15,8%;
хлеб — 14,1%.

Рост цэн адзначаны па ўсіх "харчовых пазіцыях" акрамя свежай рыбы (яна стала таннейшай на 6,2%).

"Добра, — скажа нехта. — Але не толькі мяса і хлеб ядуць людзі, ёсць жа яшчэ гародніна. Магчыма, яна стала таннейшай?"

Дадзеныя мінскіх статыстыкаў такія:

буракі падаражэлі ажно на 61,8%;
перац салодкі — на 35,8%;
морква — на 32,8%;
капуста — на 31,6%;
памідоры — на 24,5%;
агуркі свежыя — на 19,2%;
часнок — на 7,8%;
цыбуля — на 5,4%.

Нават бульба стала даражэйшай на 6,1%.

Значна (у сярэднім на 40,6%) стала даражэйшай садавіна. Цікава, што нават пры добрым ураджаі яблык у краіне яны сталі каштаваць больш на 40,6%! Правільна, няхай гніюць, але цану не знізім!

Пяройдзем да нехарчовых тавараў. Яны таксама не таннелі, хаця іх кошт рос меншымі тэмпамі.

Так, бензін стаў даражэйшым на 17,3%.

Мыла і мыйныя сродкі — на 16,6%.

Мэбля — на 7,6%.

Медыкаменты — на 6,9%.

Тэкстыльныя вырабы — на 6,8%.

Знізіліся цэны толькі на веласіпеды (на 3,8%) і верхні трыкатаж (на 3%).

Нарэшце, мы з вамі вымушаны карыстацца рознымі паслугамі. Якімі ж былі цэны на іх?

У сярэднім за год яны павялічыліся на 19,3%.

Цэны на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі павялічыліся на 31,9% (узгадаем, што Аляксандр Лукашэнка публічна загадваў стрымліваць рост жыллёва-камунальных тарыфаў).

Санаторна-аздараўленчыя — на 27,6%.

Дашкольных устаноў — на 27,1%.

Турыстычныя паслугі — на 19,7%.

Бытавыя паслугі — на 19,5%.

Пасажырскага транспарту — на 13,1%.

Вышэйшай адукацыі — на 12,4%.

Медыцынскія — на 5,8%.

Цэны на прадпрыемствах грамадскага харчавання павялічыліся на 18%.

Спадарыня Валянціна, адкажыце сабе на пытанне: на колькі выраслі за гэты год вашы заробкі? Калі не выраслі ўвогуле, дык вы, даражэнькая, толькі з-за інфляцыі сталі значна бяднейшай.

Вось такія маем вынікі года.

Ірына МАЛЬЦАВА. Фота photo.bymedia.net

НАРЭШЦЕ!

Вітаем намер каманды Аляксандра Зімоўскага!

Колькі разоў — мо тысячу, а то і болей — абураўся тым, што на Беларускім тэлебачанні — ну нічагусенькі беларускага. Глядзі не глядзі, слухай не слухай — адна карціна. Выключэнне хіба цудоўны цыкл "Падарожжа дылетанта", які мне вельмі падабаецца, але які чамусьці ганяюць з канала на канал і не даюць сталага часу ў эфіры. Даходзіць да глупства, калі нават вядомыя дзеячы нашай культуры, не міргнуўшы вокам, шпараць амаль спрэс на мове суседняй дзяржавы. Сваёй жа, якую калісь годна трымалі на вуснах, сталі саромецца: не дай Бог угнявіць начальства!

Тым болей нечаканасцю (і, скажу адразу, прыемнай) з'явілася для мяне паведамленне ў апошняй нядзельнай "Панараме", што хутка на суд гледачоў будзе прадстаўлены шырокі цыкл беларускамоўных перадач, у якіх аўтары пастараюцца адлюстраваць гісторыю і сучаснасць, багацце нацыянальнай культуры і адметных народных традыцый кожнага раёна Беларусі.

Першы тэматычны ролік быў тут жа і паказаны. Праглядзеў яго з цікавасцю і задавальненнем. На мой погляд, нават першы крок у гэтым кірунку трэба вітаць і пажадаць стваральнікам цыкла поспеху і творчага запалу. Калі так пойдзе і далей, то буду вельмі рады. І, думаю, не толькі я. Многія беларусы даўно задыхаюцца ад адсутнасці беларускага "азону" ў сённяшняй грамадскай атмасферы. Няўжо, нарэшце, дайшло і да кіруючых вярхоў, што так жыць нельга, што ўсе размовы пра "укрепление независимости" і "суверенность" краіны — пусты гук без нацыянальнай свядомасці, гістарычнай памяці народа і самога падмурка — мовы тытульнай нацыі дзяржавы?

Разумею, біць у ладкі яшчэ заўчасна: пачаткам беларусізацыі ў грамадстве пакуль і не патыхае. Дзеля гэтага трэба ставіць на нацыянальную аснову адукацыю і культуру, усе сферы дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Ды, рана ці позна, гэта ўсё роўна прыйдзецца рабіць. Можа, добры намер БТ пад кіраўніцтвам Аляксандра Зімоўскага — прыкмета асэнсавання такой неабходнасці?

Міхась ДУБОЎСКІ, жыхар Брэста.

ПОЗИЦИЯ

Какое счастье, что моя внучка раньше закончила гимназию

Прочла статью "Школа, ад якой не стамляешся" и искренне позавидовала ее учащимся: английский язык дважды в день, обязательное изучение истории и культуры разных стран мира и так далее.

Весь мир изучает иностранные языки, чтобы ездить, общаться, знакомиться с культурой, историей, бытом других народов, а у нас по новой реформе в школах изучение иностранных языков сведено к минимуму, изучение мировой культуры нашим детям вообще почему-то не нужно. Как можно так обеднять себя?

Ввели факультативы, но они не обязательны для посещения.

Меня, педагога, поражает такая установка: предметы во всех школах будут изучаться только на базовом (самом низком) уровне.

Несколько слов о городских и сельских школах. Уровень подготовки у них, понятно, разный. В глубинке не хватает учителей и зачастую один ведет 2—3 разных предмета. Казалось бы, нужно решать эту проблему. Ан нет.

Мне кажется, реформа направлена не на то, чтобы поднять сельские школы до уровня городских, а наоборот, сравнить городские школы по уровню с сельскими.Если раньше в школах равнение было на лучших, то сейчас, видимо, равняться будут на отстающих. Нам что, нужно, чтобы вся страна стала серенькой и средненькой? Такой страной легче управлять?

Если вы купили свой сотовый с рук, он вполне может оказаться кем-то потерянным или, что еще хуже, украденным. Проверить это можно, воспользовавшись другим интернет-сервисом — Onliner IMEI Blacklist. Это единая база номеров IMEI утерянных и украденных телефонов стандарта GSM. Адрес в Сети — http://www.onliner.by/imei/index.php

Любой интернет-пользователь может занести в эту базу данных информацию об украденном или утерянном телефоне, а также проверить приобретаемый телефон.

А вот как выглядит белорусская статистика по потерянным и украденным телефонам:

Производитель	В розыске
Nokia	3152
Sony Ericcsson	1752
Samsung	1651
Siemens	1421
Motorola	1071
Другой	566
LG	198
Alcatel	143
Panasonic	123
Ericsson	106
Mitsubishi	61
Philips	59
Sony	47
Sagem	38
Trium	22

Ну а что делать тому, кто потерял свой телефон? Во-первых, заблокируйте исходящие звонки, позвонив в отдел обслуживания вашего оператора. Попытайтесь позвонить на свой телефон, возможно, его просто вернут за скромное (или не очень) вознаграждение.

Помните о возможности детализации звонков. Если телефон украден и злоумышленники звонили по нему, то, взяв у оператора сотовой связи детализацию, можно узнать, по каким номерам звонили.

Ну и, конечно, обязательно внесите номер IMEI своего телефона в базу данных Onliner IMEI Blacklist. Вполне возможно, что через некоторое время ваша трубка где-нибудь "всплывет".

Виктор ДЕМИДОВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

Алесю Няўвесю — 50!

Чытачы "Народнай волі" знаёмыя з творчасцю паэта Алеся Няўвеся, які ў вершаванай фельетоннай форме высмейвае самыя розныя недарэчнасці, глупствы, кур'ёзы, што адбываюцца ў нашым грамадстве.

Майстар сатырычна-гумарыстычнага пяра днямі адзначыць 50-годдзе.
"Народная воля" віншуе яго з юбілеем і прапануе чытачам чарговую нізку яго вершаваных фельетонаў.

Эксперымент

"Супрацоўнікі Навуковага цэнтра экалагічнага выжывання і бяспекі правялі эксперымент. Яны аблаялі мацюкамі звычайную ваду, а затым палілі зерне звычайнай пшаніцы. З зерня, палітага вадою з агрэсіўнымі мацюкамі, узышло 48%. З зерня, палітага вадою з бытавымі мацюкамі, узышло 53%. А насенне, палітае вадою, якая не чула брыдкаслоўя ніколі, дало 93% парасткаў".

"Труд-7".

Старшыня калгаса —
Не тупіца.
І з газет набыў пасыл такі:
На ўраджай —
Ці жыта, ці пшаніцы —
Дрэнна
Уплываюць мацюкі.
"Вось чаму, —
Падумаў туз калгасны, —
Што ні лета-восень,
То няўрод.
Вінаваты —
Гэта зараз ясна! —
Быдлаваты,
Цёмны наш народ.
Усяго ў Амерыкі ад пуза,
Свой калгас
За ёю павяду.
Родзяць там ячмень і кукуруза,
Бо не плешчуць розную брыду.
Як у нас жа?
На палях няўдоба
Ці са строю выйшаў агрэгат,
Ёсць на ўсе "няўдобы"
Майстар добры,
Самы векавечны майстра —
Мат.
Час наспеў, —
Прыйшоў ён да высновы. —
"Майстру-мату"
Палажыць канец,
У калгасе
Мацернаму слову
Забарону ўвесці —
І... звяздзец!"
...Хто "брыдоціў",
Тых каралі штрафам
(Бач, параспускалі языкі).
Сталі жыць калгаснікі са страхам,
Застравалі ў горле мацюкі.
Ледзь не ўсе калгаснікі —
Нямыя,
Не чутно ні сварак, ні размоў.
Хто ж у нас знароку
Матам крые?
Так усе гавораць...
"Звязка слоў"...
А без "звязкі слоў" —
Чаго мы варты?
Справу не даробіш ні адну.
Старшыня —
Хлапчына дужа ўпарты,
Штрафамі
Напоўніў ён казну.
Толькі трактарыст гарачы Грыша
Памяне няўзнак "такую маць",
Старшыня
У свой блакнот запіша
(Грышу грошай
Меней атрымаць).
А калі — крый Бог! —
Даярка Света
Лаецца на Мілку
На чым свет,
На заробак
Накладуць ёй вета,
І даярчын трэснецца бюджэт.
Як жа перажыць такое гора?
Наш народ без мата —
Ну ніяк!
Хтосьці парашыў падацца ў горад,
Хто ў запой...
А быў і добры знак!
Нібы ў казцы:
Сенажаці, нівы —
Проста той
Амерыканскі рай!
Старшыня
Узнёслы і шчаслівы —
Вырас аж да неба
Ураджай!

***

А карысці шмат з таго калосся?
З тых багатых
Сенажацяў-ніў?
Каб сабраць —
Людзей не засталося,
І на карані ўраджай той згніў...

Шпіён

"Супрацоўніка Беларускай службы Радыё Свабода Ягора Маёрчыка прызвалі на вайсковыя зборы — як псіхолага ў запасе. Аднак "праслужыў" ён усяго тры гадзіны... Відаць, разабраўшыся, дзе ён працуе, армейскае начальства тэрмінова забрала Маёрчыка з вайсковай часці і запэўніла, што на "зборы" яго болей не забяруць ніколі..."

"Снплюс"



"На вушы стаў"
Увесь Генштаб,
І час наспеў гарачы,
Бо контрразведкі дух аслаб —
Заеліся, няйначай.
Шпіён
"У строй" забрацца змог
(Былі таму сігналы),
І вось цяпер перапалох,
Бяда
Для генералаў.
Адкуль жа ўзяўся
Той шпіён?
(Няма на гадаў зводу!).
Як "у рады" зацёрся ён?
Ды з Радыё Свабода!
(Быў ваенкома недагляд.)
Ўзялі яго на зборы.
І што цяпер?
Ніхто не рад,
Для ўсіх служывых гора.
І вось трохзорны генерал
Сабраў сваіх "васалаў".
— Вам у адстаўку не пара?
І пендзюлей вам мала?
Вы перасталі, парні, бдзець!
А мір сягодня шаткі!
І контрразведка наша гдзе?
Чаму "праспалі ў шапкі"?
А ён жа
(Эткаму не вер!)
Падложыць нам падлянку
І ў Запад выдасць, напрымер,
Як круцім мы парцянку!
А еслі ён
Прадасць сякрэт
*Ваздушнага "сэ-трыста" *?*
Тагда бярыце пісталет
І пулю ў лоб —
Са свістам...
Дык ён жа, можа, дзіверсант
(А ў нас ахрана — гола!).
І ён нацдэм, канечне, сам,
К таму жа і псіхолаг.
Разложыць ён
Усіх салдат
І іх маральны воблік...
Дак іх жа з роты —
І ў штрафбат.
(Дапрыгаліся,
Во, бля!)
І ў гасударсцве
Быць бядзе
(Вы ў галаву вазьміце!):
Салдатаў з часці павядзе
На Бангалор,
На міцінг.
Яны —
Дзяржыце на уме! —
Не з нашанскага цеста.
Па іх не ў арміі — ў турме
Даўно ўжо плача месца.
Я вывад дзелаю ў канцы:
Шчытаць вапрос рашоным.
Прыказ:
Як некагда атцы
Мы скажам —
"Смерць шпіёнам!"
Ну, смерць — не смерць,
А верталёт
Падняўся па загаду.
І з часці
"Прапар-патрыёт"
Забраў
"Нацдэма-гада".

***

Няма ад глупства болей сіл,
Бягуць у рукі тэмы...
Ад службы хочаш "адкасіць"?
Запісвайся ў "нацдэмы"!

---

* "С-300" — самы надзейны проціпаветраны комплекс, які стаіць на ўзбраенні расійскай і беларускай армій.

«Не пущать!»

"Супрацоўнікі мытні канфіскавалі ў сакратара аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" (БХД) Дзяніса Садоўскага інфармацыйныя матэрыялы. Інцыдэнт адбыўся зранку 14 жніўня ў Брэсце. Група маладых палітыкаў накіроўвалася ў Польшчу для ўдзелу ў семінары "Перспектывы хрысціянскай дэмакратыі ва Усходняй Еўропе". На мяжы ў Д. Садоўскага былі канфіскаваны дыскі з інфармацыяй пра сталінскія рэпрэсіі і тэкстам твораў Васіля Быкава".

"Народная воля".

Не дрэмле доблесная мытня!
Кантрабандыст —
Яе мішэнь.
... За шкіркі прыхапілі злыдня,
Ледзь не насоўгалі ў каршэнь.
— Табе не пісаны законы?
На лбу пішы?
Ядрона вош...
Панапладзіліся шпіёны...
Ты што, нацдэмавец, вязёш?
Цяпер табе, дружышча, —
Крышка!
Дый не дружышча — свалата.
Ну пусць на дысках,
Пусць не ў кніжках.
На гасударства — клевята.
— Ды тут пра Сталіна,
Пра час той,
Пра незлічоны спіс ахвяр...
— Малчаць!
Крамола здзесь — і баста! —
Крывёй наліўся мытны твар.
— Не чулі вы пра Курапаты?
Там, можа, бацька ваш...
— Малчаць!
— Дык ён жа быў тыран-дыктатар...
І пракраціць мне здзесь дэбаты!
Якім быў Сталін —
Мне рашаць.
Быў Сталін бацькам! —
Так нас учаць.
Ён пабядзіў тагда ў вайну.
І ён —
Вось вам такая б учасць! —
Ўрагоў народа ў рог сагнуў.
А эта кто?
Какой-та Быкаў?
А можа,
Ваш "евангеліст"?
Я знаю, быў акцёр вялікі,
Яшчэ быў Быкаў-хакеіст.
— Ды то ж пісьменнік наш народны,
Славуты ён на цэлы свет...
— Ах, эта тот,
Што ўрэдна-шкодны?
Я знаю з нашанскіх газет!
— Ды з Быкава —
Якая шкода?
Вы хоць адзін чыталі твор?
— Яшчо чаво!
Таможны кодэкс
Я не асіліў да сіх пор.
— Вайну апісваў...
Меў падставы...
— Прадацель Быкаў!
І на жаль,
Я штампік сам яму паставіў,
Кагда да немцаў ён бяжаў1.
"Нацдэм" няшчасны —
У адчаі...
— Рашаю так я не адзін:
Чытаць і дома запрашчаем,
І за граніцай не дадзім!

***

Мы ўсе
Адчулі хоць патроху
Увесь той жах
І тое зло.
Зусім не пры цары Гароху
Быў час, быў век, была эпоха2...
Але ці ўсё сышло ў "было"?

---

[1] Апошнія гады перад смерцю Васіль Быкаў вымушаны быў жыць у эміграцыі — у Германіі і Фінляндыі.
[2] Вызначальны радок са славутай і некалі ананімнай сатырычнай паэмы "Сказ пра Лысую гару" (нядаўна стала вядома, што яе напісаў Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч).

Пра агурок і плаўлены сырок

"Да кожнага з дванаццаці помнікаў Леніну, якія захаваліся ў Бабруйску, рашэннем гарвыканкама прыстаўлены шэф-наглядальнік і прыбіральшчык у адной асобе. У адказныя "за Леніна" трапілі санаторый імя Леніна, аддзел адміністрацыі Ленінскага раёна, "Фандок", мясакамбінат і 40-я база аховы. За правадыра пралетарыята на аднайменнай плошчы будзе адказваць гарадское "дарожна-эксплуатацыйнае ўпраўленне".

"У Шклове ўжо другі год запар праходзіць Свята агурка. Падчас яго каля мясцовага Дома культуры адкрылі помнік Агурку — гэта мужычок з кошыкам агуркоў. Вырабіў яго магілёўскі скульптар Андрэй Вераб'ёў і назваў Агуродцам. У наступным годзе, як абяцаюць, з'явіцца і гімн Агурку".

"Народная воля".



Савецкі час
Мне не ўспрыняць цвяроза.
Куды ні плюнь —
Усюды Ільічы.
А догляд дзе?
То набрыдоцяць козы,
То галубы нагадзяць на плячы.
І з гэткае агіднае нагоды
Сабраў кіраўнікоў бабруйскі мэр.
— Я кляўся перад ім...
Служыць народу...
Я камсамолец быў...
І піянер...
А як жа пераемнасць пакаленняў?
Наш правадыр,
Прабачце, у г...
Ну, карацей:
Каб быў чысцюткі Ленін,
Чысцюткі,
Нібы шыба у вакне.
І ўсе яны пабеглі чысціць-драіць.
І нават быў бязголасны разлад:
Начальнікі
Шчапіліся ў раздраі —
Хто лепш пачысціў Ільічовы зад.
Адзін начальнік,
Разумнейшы трошкі,
Зрабіў, на жаль, усё наадварот:
Прыклеіў Ільічу на голаў
Рожкі.
І атрымаўся —
Выліты! —
Ну чорт...
.... Пра помнікі
Было б няпоўным слова,
І быў бы незакончаным урок,
Калі б яны,
Насельнікі са Шклова,
Не выставілі помнік-Агурок.
О, агурок!
Ты — сімвал той эпохі,
Што нам Ільіч калісь наканаваў.
Ты быў нам закусь.
І расолу трохі,
Як з раніцы балела галава.
А дзе ж было
Узяць якую закусь?
Нішчымніца...
Да камунізму — крок...
Вось так жылі...
Было ўсё "сікась-накась"...
Сарвеш на градах жоўты агурок...
А ў магазіне —
Плаўлены сырок...
А болей у мяне і слоў нямашка.
І выдам я,
Як кажуць, "прэс-рэліз":
Да агурка
Яшчэ б нам помнік-Пляшка,
І будзе ўвесь савецкі рэалізм.

* * *

Мой фельетон —
Зусім жа не дакорам
Тым,
Хто паставіў помнік агуркам.
Хай будуць Агуркі і Памідоры,
Што не раўня
Усім правадырам.

З песняй па гульні

"Асабліва засмучаныя балельшчыкі адразу пасля паражэння ад Люксембурга прапанавалі нашым футбалістам перакваліфікавацца ў... спевакоў. Справа ў тым, што ў трэнерскую методыку Штанге ўваходзяць спевы спартсменаў. На кожнай трэніроўцы Штанге назначае "запявалу", а астатнія — на падпеўцы. Штанге гаворыць, што некаторым можна паспрабаваць свае сілы ў караоке..."

"Народная воля".

Сказаў гульцам замежны трэнер:
— Я вам
Надзейны метад дам:
Для рэзультата
Спевы трэба
Увесці ў трэніроўкі нам.
Мы перамогамі адорым!
Нам будуць пляскаць гледачы!
І заспявалі хлопцы хорам.
(А лепей —
Білі б па мячы...)
Калі сапернік —
Гранд вялікі
І ўяве паражэнне-зло,
Яны спявалі "Вераніку"
("Няма таго, што раньш было"...).
А форвард мовіў:
— Можа збыцца —
Згуляць удасца ўнічыю,
То ля старога я гасцінца
"Прылягу-лягу" запяю.
Для перамог —
Матыў нікчэмны
(Ты болей бегай — не ляжы).
І развучылі хлопцы гімны,
Каб быць заўжды на куражы.
Падумаў трэнер
Самы старшы...
— Каб быў дакладны пас-удар,
Няблага нам было б і маршы
Увесці
У рэпертуар.
Маршыравалі хлопцы строем
Пад беларускі слаўны гімн,
Нібы спартанцы, ў рад па трое:
Дрыжы-трымці, сапернік,
Згінь!
І так гульцы спявалі многа,
Такі настрой,
Такі запал,
Што ім —
Шырокая дарога
На "Еўрабачанне", ў фінал.
Ды толькі вось бяда-нядоля,
Што вынік з гэтага малы:
Спявалі на футбольным полі,
А ім —
Закочвалі галы.

* * *

Ну што каманда паказала,
Калі спявала
Гімн і марш?
Дык ці не час асвоіць зараз —
Апошні шанец! —
"Ойча наш"?..

«Хто мы?»

"З гэтага навучальнага года купалаўскія "Тутэйшыя" пераходзяць у спіс літаратуры, якую чытаюць толькі ў класах з паглыбленым вывучэннем прадмета, у звычайных жа класах са славутай п'есай знаёміцца неабавязкова. Школьнікаў чакаюць і іншыя "аблегчаныя" нагрузкі.

...Адбылося скарачэнне гадзін на вывучэнне твораў вядомых аўтараў з Беларускага саюза пісьменнікаў, затое зараз у школе будзе болей вывучацца творчасць сяброў новаяўленага Саюза пісьменнікаў Беларусі — такіх як Мікалай Чаргінец, Аляксандр Скарынкін і іншыя.

"Мне шкада нашых школьнікаў, якія становяцца ахвярамі такіх эксперыментаў, — кажа Уладзімір Арлоў. — Зараз мы дрэйфуем да праграм савецкага часу, і нічога добрага гэта нашай літаратуры не прынясе".

"Труд-7".

Я вас віншую,
Мікалай Іваныч!
Цяпер заместа Быкаўскай лухты
І школьнікам,
І немаўляткам нанач —
Чытаем "геніяльны" дэтэктыў!
О, дэтэктыў!
Які там Быкаў-класік?
Вайна і смерць...
Траншэя і акоп...
А мы
Навучым іх,
У сёмым класе,
Са снайперскай —
І "шлёп" адразу ў лоб.
Што да паэтаў...
Іх у нас, як вошай.
(Ну хто не рыфмаваў "весна-красна"?).
— Хар-рошы ў нас паэт,
Такі хар-рошы!
...Такі "харошы",
Што паслаць бы на...
Іванавіч!
Не трэ' лічыць абразай,
Не трэ' мяне
Цягнуць адразу ў суд.
Бо графаманства —
Гэткая зараза,
Як клін:
Куды ні кінь —
І там, і тут.
Якія ўжо там "людзі на балоце"?
Каму патрэбны Ганна і Васіль?
Цяпер — бандыты.
Хто каго супроціў,
І аўтаматам
Хто каго "скасіў".
Я не кажу
Пра звыклую "халтуру",
Што пішацца, як кажуць, "налегке".
Ды беларускую —
Крый Бог! —
Літаратуру
"Мы выучым на русском языке"?
А з Тых Нябёс
Глядзіць-маўчыць Купала,
І Колас
Працінае навылёт.
Няўжо таго,
Што выпала нам,
Мала?
Няўжо загіне
Беларускі род?

***

Сумленне...
Не купіць яго ніколі.
І ў свеце Тым
Нам не прабачаць здрад.
Храм Артэміды
Мы не ўбачым болей.
Ды ў памяці застаўся
*Герастрат...**

---

* Герастрата памятаюць толькі таму, што ён спаліў адно з сямі цудаў свету — храм Артэміды.

Як конюх Хведар рашыў паразумнець...

"Ноч, праведзеная ў агульным ложку з партнёршай, негатыўна адбіваецца на рабоце мозгу мужчыны, мяркуюць аўстрыйскія вучоныя. Яны прыйшлі да высновы, што часовае зніжэнне разумовых здольнасцяў, выкліканых недасыпаннем, назіраецца ў мужчын пасля ночы ў шлюбным ложку незалежна ад таго, займаліся яны сексам ці не".

"Народная воля".

Калгасны конюх Хведзя-Хведар
Хоць і не скончыў трэці клас,
Як ён лічыў,
Нямала ведаў,
Разумнік быў на ўвесь калгас.
А хто ўсумніцца мог у гэтым?
Дык ні для кога ж не сакрэт:
Выпісваў Хведар тры газеты
І шмат чаго,
Апроч газет.
І прачытаў сабе на згубу
Наш конюх Хведар —
Хоць ты згінь:
Калі ты часта дзевак "любіш",
То прытупляюцца мазгі.
А тут якраз заўважыць трэба,
Што конюх Хведзя,
Далібог,
Мог без гарэлкі,
Мог без хлеба,
Але без дзевак жыць не мог.
Хоць ёсць і жонка маладая,
Як кажуць,
З малаком ды кроў.
Але яна заўсёды —
"З краю",
Бо Хведар —
"Конюх" будзь здароў!
Была каханкаю Паліна,
Што на другім канцы сяла.
Наталля сэрца "запаліла" —
Такою жарснаю была.
А Антаніна...
Адмыслова
Там цыцка кофтачку ірве!
Марыля, Зіна, Люба...
Словам,
Адны жанчыны ў галаве!
Ды каб жа ў думках...
Як абслуга,
Для іх быў Хведар,
Як самец.
"Ды вось чаму я мыслю туга!
Цяпер любоўніцам —
Капец!
Мае ўсе высмакталі сокі,
Мой розум згвалцілі яны!
А быў жа мой палёт —
Высокі...
І вось цяпер хаджу дурны..."
Якая ж просіцца выснова?
Рашыўся Хведар:
"Ёрш твой медзь!
Жыву без сексу!
Канчаткова!
І буду хутка разумнець".
Так і зрабіў.
І ўжо праз тыдзень
Пайшоў па вёсцы пагалос:
— Засачкаваў
Наш Хведзька-злыдзень,
Раней жа...
Гэтым самым...
Трос...
Яшчэ за ім хадзілі цугам,
Ды нават жонцы мовіў "зух":
— Палезеш —
Вось табе папруга,
І адлупцую,
Як казу.
"Хоць я Капернікам не стану,
Дык хай хоць будзе Фарадэй".
Ніхто не бачыў Хведзю п'яным,
Ды пазбягаць ён стаў людзей.
То, бач, пад яблыняй заляжа,
Ну акурат як той Ньютон.
А то і ў сажалку,
Ля пляжа,
Як Архімед,
Залезе ён.
І вось выснова з "ёрш твой медзі":
Прыціхла бурнае сяло...
Нічога тлумнага да Хведзі
У галаву ніяк не йшло.
Ляцелі яблыкі часамі —
Былі "гнілымі" ўсе яны.
А тут яшчэ ўзбрыкнуў...
Той самы...
І сталі трэскацца штаны...
Падумаў Хведар:
"Што за д'ябал!
Пакуль мацак,
Пакуль не дзед,
Мне трэба секс,
Мне трэба баба!
І хай ён згіне,
Архімед!"
І распусціў наш Хведар крылле!
Найперш —
"Галоўнае крыло"...
І з "ім"
Падаўся да Марылі.
Але не тут яно было!
— Ёсць у мяне даглядчык Вася.
І "конюх" Васечкі —
Будзь-будзь!
Пайшоў наш Хведар па калгасе —
Ну трэба ж да каго "прымкнуць"!
Яшчэ ж была даярка Зіна,
Яна —
Другая на чарзе.
— Я Грышку сватаць прывазіла,
Дык ён у горад павязе...
Ну хоць ты дай ад злосці дуба!
Такі няўрымслівы імпэт!
— Пайшоў ты вон! —
Сказала Люба. —
Ёсць у мяне...
А хто — сакрэт.
Няўжо "мужчынскі пал" патоне
І ўсюды поўненькі адлуп?
Апошні шанец —
Цыцкі Тоні.
— Пайшоў ты на...
Пайду я ў клуб.
І дзеўкі ўсе,
І развядзёнкі
Сказалі Хведару:
— Адлуп!
Што ж, кіраваць пара да жонкі
І рыхтаваць да кары чуб.
Пашкандыбаў дахаты Хведар
І там даведаўся,
Як след:
— А я сыходжу да суседа.
Такі імпэтны ён,
Сусед!..

* * *

І ўсё зрабіў наш Хведар крута —
Больш не выпісвае газет.
А што былі,
Сабраў у скрутак
І перанес яго ў "клазет".

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ЛЁС ЧАЛАВЕКА

Узлёт і трагедыя Алега Караваева

Алег Караваеў — першы беларус, які стаў алімпійскім чэмпіёнам па грэка-рымскай барацьбе. Трыумфальным для яго стала выступленне на XVII Алімпіядзе ў Рыме ў 1960 годзе. У сваёй вагавой катэгорыі да 57 кілаграмаў ён выйграў усе паядынкі.

Як сведчаць людзі, што добра ведалі атлета, Алег Караваеў так і не змог адаптавацца ў пасляспартыўным жыцці. Пасля завяршэння спартыўнай кар'еры Караваеў стаў часцяком зазіраць у чарку. У рэшцэ рэшт, не вытрымала сэрца атлета. Яно спынілася 23 жніўня 1978 года. Караваеву было ўсяго 42 гады...

Алег Караваеў пачаў займацца барацьбой даволі позна — у шаснаццацігадовым узросце. Яго першым трэнерам быў Іосіф Аборскі. Менавіта ён разгледзеў у Караваеве незвычайны барцоўскі талент. Алег хутка нагнаў сваіх аднагодкаў, якія прыйшлі ў секцыю раней за яго. Акрамя вялікай працаздольнасці прырода ўзнагародзіла Алега і неблагімі спартыўнымі данымі — адменнай пластычнасцю, каардынацыяй, рухавасцю...

Ва ўсе часы барцы падзяляліся на "сілавікоў", якія праводзяць паядынкі з пазіцыі сілы, і "тэхнароў", якія перамагаюць на дыване за кошт тэхнікі правядзення прыёмаў. Караваеў належаў да апошніх. Яго фірмовым прыёмам быў класічны накат. Ён не любіў штурханіны на барцоўскім дыване — усе ягоныя схваткі былі яркімі спектаклямі, дзе сам спартсмен адыгрываў галоўную ролю.

У 50—60-я гады мінулага стагоддзя беларуская барцоўская школа перажывала сапраўдны ўзлёт. Так, на чэмпіянаце Савецкага Саюза ў 1958 годзе беларускія барцы класічнага стылю ў камандным заліку занялі другое месца. Праз год на Спартакіядзе народаў СССР беларусы былі трэція.

Да рымскай Алімпіяды заставалася ўсяго нічога — і спадзяванне на поспех трэнерскі штаб алімпійскай барцоўскай каманды ўсклаў менавіта на Алега Караваева. У Італію Алег прыехаў у рангу чэмпіёна свету.

...Ішоў пяты дзень Алімпіяды. На рахунку зборнай СССР па барацьбе не было ніводнага медаля...

У першым туры Алег Караваеў бароўся з нарвежцам Джонам Твэйтэнам. Маючы на сваім рахунку аж 18 балаў, чаго, безумоўна, хапіла б для перамогі, Караваеў вырашае рызыкнуць — ён ідзе ў атаку, але сам нарываецца на сустрэчны контрпрыём нарвежца... Твэйтэн прыдавіў беларуса ўласным целам і быў упэўнены ў перамозе. Аднак Караваеў здолеў вырвацца і ўжо праз хвіліну яго сапернік быў укладзены на лапаткі...

Другі паядынак Караваева на Алімпійскім турніры скончыўся даволі хутка — бельгіец Верховен быў звергнуты за 1 хвіліну і 28 секунд. У фінале, а гэта была шостая схватка Караваева на Алімпіядзе, беларус выйграў па балах у румына Чэрні.

Па выніках спаборніцтваў у Рыме беларус быў прызнаны самым тэхнічным спартсменам.

Пасля Алімпіяды Караваеў яшчэ аднойчы стаў мацнейшым барцом на планеце. Здарылася гэта ў 1962 годзе.

Самае цяжкае для спартсмена, які за сваю кар'еру дасягнуў пэўных вышынь, — гэта адаптацыя ў "цывільным" жыцці.

Пасля заканчэння актыўных выступленняў Караваеў працаваў трэнерам у спартыўным таварыстве "Буревестник".

Чалавек, які быў сапраўдным вулканам на барцоўскім дыване, аказаўся абсалютна бязвольным у пасляспартыўным жыцці...

Да сваёй трагедыі Алег Караваеў пачаў ісці ў пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя. Жыццё Караваева адзін да аднаго нагадвала гісторыю хакеіста Гурына, сыгранага акцёрам Фацюшыным у фільме "Москва слезам не верит".

Што стала прычынай надлому вялікага спартсмена? Дакладна на гэтае пытанне не адкажа ніхто. Тыя, хто ведаў Алега Караваева, гавораць, што яго згубіла ўласная дабрыня. Ён быў вельмі шчырым чалавекам, не мог адмовіць "сябрам", якія ў піўных расказвалі адзін аднаму, што ўчора пілі з самім Караваевым... Усё пачыналася з келіха піва, а потым у ход ішлі віно і гарэлка. З часам алкаголь стаў адзінай страсцю спартсмена. Ён прадаў уласны гараж, затым "Волгу". За грошы, атрыманыя ад іх продажу, ён частаваў шматлікіх "сяброў", якіх з кожным днём станавілася ўсё болей...

У апошнія гады жыцця медыкі паставілі Караваеву дыягназ "цукровы дыябет". Сваю дыябетычную кніжку Караваеў заўжды насіў у кішэні пінжака. Менавіта гэтая акалічнасць аднойчы ўратавала яго ад смерці. Ідучы па вуліцы, Караваеў згубіў прытомнасць. Выпадковыя прахожыя, якія тэрмінова выклікалі "хуткую", расказалі прыехаўшым медыкам, што чалавек пакутуе на цукровы дыябет... Урачам удалося ўратаваць Караваева. Яго тэрмінова адвезлі ў шпіталь.

У апошні год жыцця Алег Караваеў часцяком ляжаў у бальніцы — у лечкамісіі. У жніўні 1978 года ён зноў апынуўся там. Людзі, якія прыходзілі да спартсмена, адзначалі, што ў тыя дні ён выглядаў дрэнна — быў слабы і бледны...

Нехта з асабліва "руплівых" наведвальнікаў паддаўся на ўгаворы Караваева і пазычыў яму грошай. Алег уцёк з бальніцы. Ён прыехаў да "сяброў", трымаючы ў руках некалькі бутэлек спіртнога...

Пачалося апошняе ў жыцці Караваева застолле, падчас якога ён памёр. Ягоныя сабутыльнікі, выклікаўшы машыну "хуткай дапамогі", прыезду медыкаў не дачакаліся. Яны папросту спужаліся і збеглі, не забыўшыся зняць з пінжака спартсмена значок "Заслужаны майстар спорту"... Медыкі, якія прыехалі на выклік, канстатавалі смерць Караваева...

Заслужаны майстар спорту Алег Караваеў пахаваны ў Мінску на Чыжоўскіх могілках. З 1994 года ў Беларусі праводзіцца барцоўскі турнір, які носіць імя Алега Караваева...

Віталь ГАРБУЗАЎ.



ДАВЕДКА

КАРАВАЕЎ Алег Мікалаевіч (грэка-рымская барацьба).
Нарадзіўся 20 мая 1936 года ў Мінску.
Заслужаны майстар спорту.
Чэмпіён XVII Алімпійскіх гульняў у Рыме (Італія) 1960 года ў вагавой катэгорыі 57 кілаграмаў. Двухразовы чэмпіён свету (1958 г. і 1961 г.).
Сяміразовы чэмпіён СССР (у 1956—1960 гг., 1962 г.).
Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём "За працоўную выдатнасць".

ШАШКІ

Камбінацыі мінчаніна

Працягваем **бліц-57** заданнем №2 — камбінацыяй мінчаніна Уладзіміра Мазаніка:



Белыя: a5, c1, e1, g5, h2, h4 (6).

Чорныя: a3, a7, c3, c5, e3, e7, f4 (7).

Выйгрыш.

Пераможца конкурсу будзе заахвочаны. Чакаем адказы па адрасе: **220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", рубрыка "Шашкі".**

У.Мазанік даслаў у рэдакцыю яшчэ тры камбінацыі на 64-клетачнай дошцы. Разгледзьце іх па-за конкурсам:

1.**Белыя:** a1, a5, c1, e3, f2, f4, g1(7).

Чорныя: a3, b4, c3, c5, d4, f6, g7 (7).

1. fe5 fg5 2. ef4 g:e3 3. ef6 4. ab2 5. a:c3 6. f:f6 cd4 7. gf2 dc3 8. fe3 cd2 9. fe7/g7 10. f8 fe3 11. cd2 12. fh6 13. h:c1x.

2.**Белыя:** a1, c1, d2, f4, f6, g5, g7, h2 (8).

Чорныя: a5, b4, c5, c7, d6, d8, f2, g3, h8 (9).

1. ab2 2. f:b6 3. de3 4. hg3 5. bc3 6. c:e7 7. b:e1x.

3.**Белыя:** b6, c1, c7, d2, d6, f2, g3, h2 (8). **Чорныя:** b4, b8, e5, f4, f8, g5, g7, h4 (8). Перавагу за белых пашукайце самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Самаправерка

Давайце яе зробім на заданні №1 (аўтар В.Шульга) бліца-57: d8, l h4, b8, f6, a3x. l g5?, b8 (h6)=.

Дарэчы, Віктар Шульга не толькі стаў майстрам ФМЖД па складанні праблем, але быў яшчэ і чэмпіёнам свету па іх рашэнні, выканаў норму міжнароднага майстра. Акрамя таго, добра справіўся з абавязкамі суддзі-каардынатара міжнароднага конкурсу памяці Г.Далідовіча, аб якім чытайце ніжэй. В.Шульга — нацыянальны майстар і чэмпіён Беларусі па шашачнай кампазіцыі. Ды і прафесія ў яго творчая — майстар па вырабу васковых свечак з мастацкім афармленнем у Елісавецінскім кляштары ў Мінску.

Вытрымалі экспертызу

Аб выніках міжнароднага мемарыяльнага конкурсу беларускага майстра задачнага мастацтва Гары Далідовіча мы паведамлялі раней. Тады прывялі "чамчужыны" на 100-клетачнай дошцы, якія па сваім змесце ўвайшлі ў дзесятку лепшых. Сёння знаёмім нашых суайчыннікаў з астатнімі канструкцыямі. Яны таксама вытрымалі сур'ёзную экспертызу і суддзямі Я.Бюсам (Германія), М.Грушэўскім (Беларусь) і Е.Зубавым (Расія) былі прызнаны кампазіцыямі.

У катэгорыі В:



1 (Васіль Грабенка, Мінск). **Белыя:** 6, 11, 17, 24, 26, 29, 30, 34, 37, 39, 41, 47 (12). **Чорныя:** 1, 8, 13, 14, 25, 28, 31, 32, 35, 36, 38 (11).

51,75 ачка, 13—14-месцы: 7, 17, 33, 43, 1, 27, 20, 15, 3, 17 (45) 50х.

2 (Аляксандр Кагоцька, Пінск). **Белыя:** 27, 28, 31, 32, 37, 41, 47, 48, 50 (9). Чорныя: 9, 16, 19, 23, 29, 30, 38, 39, 40, 43 (10).

35,75 ачка: 47-42, 21, 44, 4, 49х.

3 (Леанід Вітошкін, Гомель). **Белыя:** 15, 31, 34, 38, 41, 43, 44, 45, 48 (9). **Чорныя:** 5, 9, 11, 20, 22, 23, 24, 26, 30, 35 (10).

29,25 ачка: 10, 28, 37, 3, 16, 11 (45) 50х.

4 (В.Малашэнка). **Белыя:** 12, 23, 28, 32, 38, 39, 42, 43, 44, 46, 48 (11). **Чорныя:** 1, 10, 13, 14, 19, 21, 24, 27, 30, 31, 34, 36 (12).

15 ачкоў: 7, 18, 9, 41, 4, 49х.

У катэгорыі С:

1 (Мікалай Вяргейчык, Гомель). **Белыя:** 6, 14, 19, 20, 21, 37, 38, 40, 42, 46, 48, 49 (12). **Чорныя:** 8, 12, 17, 18, 23, 25, 26, 28, 29, 33, 35, 39, 44 (13).

47,75 ачка, 14-е месца: 31, 31, 1, 41, 37, 13, 6, 6:15:27:17 (50) 12, 45х.

Чэмпіянат кантынента

У Таліне чэмпіёнамі Еўропы па шашках-100 сталі экс-чэмпіёны свету Гунтыс Валнерыс з Рыгі і расіянка Тамара Тансыкужына. З нашых прадстаўнікоў міжнародны гросмайстар Яўген Ватуцін набраў столькі ж ачкоў (12), колькі і другі прызёр экс-чэмпіён свету Аляксандр Георгіеў з Расіі і ўладальнік бронзавага медаля міжнародны гросмайстар з Вільнюса Эдвард Бужынскі. Па дадатковых паказчыках Я.Ватуціну прысуджана пятае месца.

Вам карысна будзе разабрацца ў наступнай сітуацыі першынства:

Белыя (Л.Літвіненка): 25, 27, 31, 32, 35, 36, 38, 40, 41, 42, 43, 45, 48 (13). **Чорныя** (М.Нагавіцына): 2, 3, 6, 8, 9, 11, 12, 13, 15, 18, 19, 22, 29 (13).

1...29-33 2...15-20 3...12-17 4...11-16 5...16:47/49х альбо 4...22-28 5...13-18 6...8:46х.

Мікалай ГЛАДКІ.

КРИК ДУШИ

Пригласите в «ложу ветеранов»

...Уважение к ветеранам, ветеранам-инвалидам и забота о них в нашей стране должны гарантироваться в любой сфере жизнедеятельности.

А вот отдельные чиновники часто забывают об этом. Я поведу речь о ветеранах спорта, которые всю свою жизнь отдали служению физической культуре и спорту. Конечно, прежде всего о внимании к ветеранам спорта — инвалидам...

Разве можно оставлять их, больных и бедных, наедине с собой, без моральной и материальной помощи? А ведь невнимание и бессердечность продолжают иметь место и сегодня. Таких примеров немало... Вот только один из них. Как известно, любовь к футболу — это страсть, присущая людям любого возраста. Это знаю по себе, так как мой стаж футбольного болельщика более 50 лет.

Для нас не увидеть большой футбол (отборочный цикл чемпионата мира 2010 года или матчи Лиги чемпионов) воочию, поверьте, катастрофа, обостряющая многочисленные болячки, лишающая сна и покоя...

Лишать нас этого последнего удовольствия в остатке жизни чиновникам должно быть, по крайней мере, стыдно. Для этих чиновников не существует вопроса: "Человек человеку — кто?". А совесть и человечность — эти ценности для них из прошлого...

"Заботу" о ветеранах спорта я испытал на собственной шкуре, когда ходил по мукам в поисках пропуска или билета, чтобы попасть на родной стадион "Динамо". К слову, в этом обществе я проработал более 30 лет, на матч с участием сборных Беларуси и Англии не попал, то же было и на матч БАТЭ—"Ювентус", на который я тоже не попал...

На столичном стадионе "Динамо" семь гостевых лож — это почти 900 мест, а возможности пригласить хотя бы 20—30 ветеранов спорта не сочли необходимым...

Как говорится, ни убавить, ни прибавить. Поистине, чиновничья "забота". Не пущать! Так как нет ни пропусков, ни билетов... И на все у них есть объективные причины. Возникает вопрос: кто хозяин этих лож и кто в них гости? Как мне сказали по секрету, хозяин их — Федерация футбола республики, а непосредственное распределение осуществляет Л.Дмитраница, исполнительный директор этой федерации. А гости этих лож — или чиновники, или "нужные" им люди, или родство...

Так что даже для ветеранов-инвалидов спорта места в ложах не предназначены. В белорусском общественном объединении "Ветераны физической культуры и спорта", членом которого я являюсь, мне сказали, что еще до начала футбольного сезона в федерацию было направлено письмо на имя Г.Невыгласа, ее председателя, с просьбой выделять хотя бы по пять пропусков на матч в одну из этих лож, но, как говорится, воз и ныне там... Просто забыли.

Может в этом вопросе поможет разобраться Комитет государственного контроля? Ведь диву даешься, когда билетов нет, пропусков нет, а у касс шныряют дельцы и предлагают билеты втридорога, причем билеты, которых-то и в кассах не было...

Уважаемые читатели! Поверьте, это не единичный частный случай, а проблема для сотни ветеранов-инвалидов спорта по всей стране... И не помогать им в том, на что они имеют законное право, заслуженное тяжелым трудом, на свободное и бесплатное посещение всех спортивных объектов с правом места, не только моральное преступление, но и грех.

С уважением —
Ю.А.ЯСИНСКИЙ,
ветеран труда,
спорта общества
"Динамо", заслуженный
тренер республики,
инвалид 2-й группы.

Ціхан і Дзевятоўскі працягваюць апраўдвацца

Днямі беларускія лёгкаатлеты Іван Ціхан і Вадзім Дзевятоўскі, якіх Міжнародны алімпійскі камітэт падазрае ва ўжыванні забароненых прэпаратаў, прадставілі ў дысцыплінарную камісію МАК пакет дакументаў. Гэта дакументы юрыдычнага, медыцынскага і іншага характару, якія, па меркаванні беларускіх спартсменаў, абвяргаюць усе "допінгавыя" прэтэнзіі на іх адрас. Зараз слова за дысцыплінарнай камісіяй Міжнароднага алімпійскага камітэта. На сённяшні дзень дата вынясення рашэння па справе Івана Ціхана і Вадзіма Дзевятоўскага невядомая.

Нагадаем, што адразу пасля Алімпіяды ў Пекіне, дзе Дзевятоўскі і Ціхан выйгралі срэбраны і бронзавы медалі, з'явілася інфармацыя аб тым, што атлеты ўжывалі забаронены прэпарат.

З адным невядомым

Жаночая зборная Беларусі па баскетболе даведалася, хто будзе яе саперніцамі на чэмпіянаце Еўропы, які пройдзе ў Латвіі ў чэрвені будучага года.

На папярэдняй стадыі падначаленыя Анатоля Буяльскага згуляюць у групе Д разам з камандамі Францыі і Ізраіля. Яшчэ адна каманда-саперніца нашай зборнай вызначыцца пазней, пасля завяршэння кваліфікацыйнага турніру, у якім згуляюць каманды Бельгіі, Італіі і Харватыі.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

«Маладзёжка» выйшла ў фінал чэмпіянату свету

Па выніках матчаў плэй-оф кваліфікацыйнага турніру вызначыліся ўсе ўдзельнікі фінальнай стадыі маладзёжнага чэмпіянату Еўропы па футболе 2009 года (узрост гульцоў да 21 года).

Вынікі: Беларусь—Турцыя — 2:0 (першы матч 0:1), Фінляндыя— ўстрыя — 2:1 (1:2), пенальці — 4:2, Англія—Уэльс — 2:2 (3:2), Францыя—Германія — 0:1 (1:1), Іспанія—Швейцарыя — 3:1 (1:2), Ізраіль—Італія — 1:3 (0:0), Сербія—Данія — 1:0 (1:0).

Такім чынам, у фінальным турніры, які пройдзе ў Швецыі з 15 па 29 чэрвеня 2009 года, акрамя гаспадароў, згуляюць Беларусь, Фінляндыя, Англія, Германія, Іспанія, Італія і Сербія.

Лёсаванне груп адбудзецца 3 снежня ў Гётэборгу.

ШАХМАТЫ

Из творчества читателей
Н.Быков

Белые: Крf4, Лe8, Фe5, Сa4, Кg7, п. d5 (6).

Черные: Крd7, Сf3, Кa5, Кg8, пп. С6, с7, е7, f7 (8).

Мат в 2 хода.

Публикуем двухходовую задачу, которую составил и прислал в редакцию наш читатель из деревни Репичи Барановичского района Брестской области. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

Семикратный чемпион!

Исполнилось 90 лет со дня рождения известного шахматиста, семикратного чемпиона Беларуси Владимира Сергеевича Сайгина. Свой путь в шахматах он начинал еще до войны. В 1943 году Сайгин сыграл вничью квалификационный матч с неоднократным чемпионом Москвы мастером Василием Пановым, и ему было присвоено звание мастера спорта. Сразу после войны Сайгин переехал в героический белорусский город Брест, в котором проживал до конца жизни. В конце сороковых и в пятидесятые годы Сайгин было одним из лидеров белорусских шахмат. Особенно успешно выступал он в чемпионатах республики, где семь раз становился чемпионом. Сайгин был шахматистом классического позиционного стиля, но мог блеснуть и комбинационной игрой, как в следующей партии, сыгранной в чемпионате БССР в 1954 году.

В.Сайгин—В.Жилц
Защита Каро-Канн

1.e4 c6 2.Кc3 d5 3.Кf3 Кf6 Рискованное продолжение, надежнее 3...Сg4 или 3...de 4.e5 Кe4 5.Кe2! Маневр, предложенный мастером Савицким. Белые подготавливают оттеснение черного коня и укрепление центра путем d2-d4 и c2-c3. 5...Сg4 (В случае 5...Фb6 6.d4 c5 7.dc К:e5 8.Кf4 e6 9.Сe2 Сc7 10.o-o o-o 11.c4 dc 12.С:e4 Кc6 13.Фe2 Кa5 14.Кh5 Фb4 15.b3 К:c4 16.bc b6 17.Кd4 у белых сильная атака-анализ И.Болеславского) 6.d4 Очень хорошо здесь 6.Кfg1!, вынуждая черные фигуры к отступлению. 6...c5 7.h3! Сc8 Вынужденно, плохо 7...Сh5 ввиду 8.Кf4 8.Кf4 e6 9.Сd3 Сe7 10.o-o o-o 11. Л e1 Кc6 12.dc! (Не соблазняясь выигрышем пешки путем 12.С:e4 de 13.Л:e4. После 13...b6 с последующим Сb7 черные получали контригру) 12...К:c5 13.c3 К:d3 14. Ф:d3 Фe7 15.Кh5 b6 16.Кg5! g6 (Плохо 16...С:g5 17.С:g5 К:e5? ввиду 18.Фg3 f6 19.К:f6+!) 17.Кf6+ С:f6 18.ef Фd8 19. Фf3 h6 20.h4! e5. Нельзя было принимать жертву коня. После 20...hg 21.hg черные не имели защиты от переброски белых фигур на линию "h". 21.Кh3 Крh7 22.Лed1 Сe6 23.С:h6! Следует блестящий комбинационный удар. 23...Кр:h6. Принятие жертвы вынужденное. 24.Кg5. Угрожает 25.Фe3 24...d4 25.cd К:d4 26.Фe3 Кf5 (Плохо 26...Ф:f6 27.К:e6+ с выигрышем) 27...К:f7++ Крh7 28.Кg5+ Крh6 29.Л:d8 К:e3 30.Л:a8 Л:a8 31.К:e6 Кc2 32.Лd1 Кd4 33.К:d4 Лd8? 34.Кf5+. **Черные сдались.**

Двойная победа В.Иванчука

В Москве прошел 3-й мемориал восьмого в истории шахмат чемпиона мира Михаила Таля (1936—1992). В его программе были гроссмейстерский турнир 20-й категории ФИДЕ и блиц-турнир. В главном турнире выступили 10 элитных гроссмейстеров. На старте лучшим был россиянин Александр Морозевич, набравший в первых 6 турах 4,5 очка. Однако затем он потерпел два поражения подряд, уступив Василию Иванчуку и обладателю Кубка мира американцу Гате Камскому. В итоге главный приз выиграл В.Иванчук, набравший 6 очков из 9 возможных. На последующих местах: 2—5.Александр Морозевич, экс-чемпион мира ФИДЕ Руслан Пономарев (Украина), Борис Гельфанд (Израиль) и Петер Леко (Венгрия) — по 5 очков, 6.Владимир Крамник — 4,5, 7—8.Евгений Алексеев (Россия) и Гата Камский — по 4 очка, 9.Шахриар Мамедьяров (Азербайджан) — 3,5, 10.Алексей Широв (Испания) — 3 очка.

Большой интерес вызвал блиц-турнир, в котором, помимо участников главного турнира, выступили победители отборочных соревнований. В финальной стадии блиц-турнира выступили 18 спортсменов. Основными конкурентами стали экс-чемпион мира Владимир Крамник и Василий Иванчук. В предпоследнем туре соперники встретились в решающем единоборстве. Успеха добился украинский гроссмейстер, который и стал победителем турнира. Второй приз достался В.Крамнику, третий — норвежцу Магнусу Карлсену.

ПАДЛІЧЫЛІ

Самы танны білет на матч «Зеніт»—БАТЭ ў 20 разоў даражэйшы за самы танны білет на матч БАТЭ—«Зеніт»

Уся краіна з нецярпеннем чакае сустрэчы паміж піцерскім "Зенітам" і барысаўскім БАТЭ. Першая з іх ужо адбылася ў аўторак, 5 лістапада будзе матч у Мінску. Цікава параўнаць кошты білетаў на гэтыя спаборніцтвы.

Цэны білетаў на гэтыя гульні адрозніваюцца ў дзесяткі разоў. Білеты на мінскі матч каштуюць 10.000, 30.000 і 50.000 беларускіх рублёў, ці ў пераліку 4,73, 14,19 і 23,65 долара ЗША. У той жа час білеты на паядынак у паўночнай сталіцы Расіі прадаваліся па 2500, 3000 і 4000 расійскіх рублёў (95,66, 114,79 і 153,05 долара).

Такім чынам, розніца ў цане самых танных білетаў у Мінску і Санкт-Пецярбургу складае 20,2 раза, сярэдніх па цане — 8,1 раза, самых дарагіх — 6,5 раза.

Пры гэтым у Санкт-Пецярбургу білеты прадаваліся "толькі пры наяўнасці пашпарта і з разліку адзін білет у адны рукі". У Беларусі — не больш за чатыры білеты ў адны рукі і без пашпарта. Усе білеты на матч БАТЭ—"Зеніт" прададзены, і перакупшчыкі ўжо перапрадаюць іх.

Ці зробім вывады?

Алег СНОЎ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік
і галоўны рэдактар
Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 22.10.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №